ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 26 (1663) | Пятніца, 30 сакавіка 1962 года | Цана 4 кап.

ТРЭЦЯМУ УСЕСАЮЗНАМУ З'ЕЗДУ КАМПАЗІТАРАЎ СССР

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза сардэчна вітае дэлегатаў Трэцяга Усесаюзнага з езда кампазітараў СССР і ўсіх дзеячоў многанацыянальнай савецкай музычнай культуры.

Дарагія таварышы! Ваш з'езд адбываецца ў знамянальныя дні магутнага ўздыму працоўнага энтузіязму і творчай ініцыятывы савецкіх людзей, якія разгарнулі гераічную барацьбу за ператварэнне ў жыццё прынятай XXII з ездам Праграмы КПСС— праграмы пабудовы камуністычнага грамадства ў нашай краіне. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі савецкі народ вырашае велічную задачу стварэння багацця матэрыяльных і духоўных даброт для працоўных.

Грандыёзныя і захапляючыя перспектывы адкрываюцца перад усім нашым народам. Паспяховае вырашэнне вялікіх задач пабудовы камунізма ў вялікай меры залежыць ад высокай свядомасці працоўных нашай краіны, ад выхавання іх у духу камуністычнай маралі, ад таго, наколькі глыбока ўвойдзе ў жыццё кожнага чалавека маральны кодэкс будаўнікоў камунізма.

Важную ролю ў выхаванні новага чалавека партыя адводзіць савецкаму музычнаму мастацтву.

Савецкім кампазітарам выпала ганаровая задача ўвасобіць у музыцы рэвалюцыйнае наватарства народа — будаўніка камунізма. Музыка — мастацтва, якое валодае вялікай сілай эмацыянальнага ўздзеяння, з'яўляецца важным сродкам фарміравання ідэйных перакананняў, маральных і эстэтычных ідэалаў людзей. Калі ў музыцы ў яркай мастацкай форме ўвасоблены высокія імкненні і пачуцці людзей— яна знойдзе гарачы водгук у сэрцах нашых сучаснікаў, натхніць іх на новыя подзвігі.

Цэнтральны Камітэт КПСС з задавальненнем адзначае, што савецкае музычнае мастацтва знаходзіцца на ўздыме, савецкая музыка займае ўсё больш важнае месца ў культурным жыцці сацыялістычнага грамадства, што творчасць савецкіх кампазітараў развіваецца ў непарыўнай сувязі з жыццём народа, усё лепш адлюстроўвае палітычную і працоўную актыўнасць савецкіх людзей.

Высокае ідэйнае значэнне і сіла савецкага мастацтва заключаецца ў яго камуністычнай партыйнасці і народнасці. Савецкая музыка з'яўляецца сапраўды народным мастацтвам, бо яна служыць працоўнаму чалавеку, духоўна ўзбагачае яго, умацоўвае ў людзях актыўныя, творчыя адносіны да жыцця. У лепшых творах савецкіх кампазітараў магутна гучыць паэзія народнага жыцця, ярка адлюстраваны рэвалюцыйны парыў і натхненне, гераічны пафас будаўніцтва новага свету.

Камунізм — гэта лад, дзе квітнеюць і цалкам раскрываюцца таленты, лепшыя маральныя якасці свабоднага чалавека.

Чым бліжэй падыходзіць савецкае грамадства да камунізма, тым багацейшым становіцца яго духоўнае жыццё, тым больш маляўніча разгортваецца мастацтва новага свету, тым больш узрастаюць мастацкія запатрабаванні людзей. Песня, опера, араторыя, сімфонія — высокамастацкія творы ўсіх відаў музычнага мастацтва—павінны ўдзельнічаць у фарміраванні камуністычнай свядомасці людзей. Савецкаму народу патрэбна больш твораў, у якіх была б выказана рамантыка подзвігу савецкіх людзей, адлюстраваны валявыя, моцныя, гераічныя характары нашых сучаснікаў, здольныя захапіць моладзь, дапамагаць яе патрыятычнаму выхаванню. Савецкія людзі — будаўнікі камунізма — варты вялікага мастацтва. Нельга мірыцца з пранікненнем у праграмы тэатраў, канцэртных арганізацый, радыёвяшчання, тэлебачання твораў, напісаных у духу пераймання мадэрнісцкай моды, разлічаных на адсталыя, дрэнныя густы. Народу патрэбны творы, якія выхоўваюць высокую культуру пачуццяў новага чалавека.

Нас радуюць поспехі музычнай культуры ўсіх братніх народаў СССР. У саюзных і аўтаномных савецкіх сацыялістычных рэспубліках вылучыліся таленавітыя кампазітары і выканаўцы, у творчасці якіх атрымалі новае сацыялістычнае развіццё прагрэсіўныя традыцыі нацыянальнага мастацтва.

Задача заключаецца ў тым, каб і далей падтрымліваць і развіваць народжаны самім жыццём працэс збліжэння і ўзаемнага ўзбагачэння нацыянальных культур братніх народаў на аснове агульнасці іх гістарычнага шляху да камунізма. Савецкія кампазітары, як і ўсе дзеячы нашага мастацтва, заклікаНы ствараць творы, прасякнутыя ідэямі сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, дружбы і непарушнага адзінства ўсіх народаў нашай Радзімы.

Жыццё з непахіснай пераканаўчасцю даказвае, што толькі пры сацыялізме магчымы сапраўдны росквіт свабоднай мастацкай творчасці. Сувязь з жыццём народа і яго ідэаламі, гарачая зацікаўленасць і актыўны ўдзел дзеячоў мастацтва ў барацьбе за перамогу новага, камуністычнага — невычэрпная крыніца для праяўлення творчай ініцыятывы ў наватарскіх пошуках. Наватарства савецкага мастацтва мае на ўвазе разнастайнасць стыляў, форм і жанраў, што адлюстроўваюць багацце ідэй, тэм і вобразаў, якія дае мастаку жыццё народа, у яго аснове ляжыць імкненне мастака праявіць свой талент, удасканальваць сваё майстэрства, каб найбольш праўдзіва і поўна раскрыць у творах мастацтва сацыялістычную рэчаіснасць.

Усёй сваёй сутнасцю савецкае мастацтва процістаіць фармалізму, недарэчным мадэрнісцкім плыням, якія адлюстроўваюць распад буржуазнага мастацтва. Даступнасць савецкай музыкі для мільёнаў людзей сведчыць аб сталасці майстэрства савецкіх кампазітараў, іх вернасці лепшым дэмакратычным традыцыям класічнай музыкі, якая з такой сілай адгукалася на думы і спадзяванні народныя. Савецкая музычная культура процістаіць і тым напрамкам буржуазнага псеўдамастацтва, якія спрабуюць надаць мяшчанскай безыдэйнасці музычныя формы, што прэтэндуюць на папулярнасць і даступнасць. Савецкія кампазітары і музыказнаўцы павінны змагацца супраць праяў рэакцыйнай буржуазнай ідэалогіі як у галіне музычнай творчасці, так і ў галіне тэарэтычнай і эстэтычнай думкі, цвёрда адстайваць прынцыпы мастацкага сацыялістычнага рэалізму.

Ствараючы новае, камуністычнае мастацтва, савецкія кампазітары аб'ядноўваюцца ў гэтай высакароднай справе з кампазітарамі братніх сацыялістычных краін. Неабходна таксама пашыраць і ўмацоўваць сяброўскія сувязі з усімі прагрэсіўнымі дзеячамі музыкі, творчасць якіх служыць справе міру, вызваленню людзей працы ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, усімі сіламі падтрымліваць перадавое мастацтва, якое процістаіць фармалізму, дэкадэнцтву.

Узрастаючае значэнне эстэтычнага выхавання народа ў перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізма ставіць новыя вялікія задачы перад кампазітарамі. Саюз кампазітараў заклікаНы мабілізаваць усе творчыя сілы савецкай музыкі на выкананне рэшэнняў XXII з'езда партыі, новай Праграмы КПСС, на далейшае згуртаванне савецкіх кампазітараў, на павышэнне ідэйнасці і мастацкага майстэрства твораў музыкі, садзейнічаць шырокаму распаўсюджанню музычных ведаў, арганізацыі новых, больш высокіх форм самадзейнай музычнай творчасці народа.

Савецкія кампазітары маюць шматмільённую ўдзячную і чулую аўдыторыю. Радыё, тэлебачанне, кіно даносяць іх музыку да ўсіх працоўных нашай краіны. Народ чакае ад дзеячоў савецкай музыкі новых таленавітых, яркіх і хвалюючых опер і балетаў, сімфоній і араторый, новых савецкіх песень высокага грамадзянскага пафасу і рэвалюцыйнай сілы.

Радасна жыць і тварыць для народа, які будуе першае ў гісторыі чалавецтва камуністычнае грамадства.

Цэнтральны Камітэт КПСС выказвае цвёрдую ўпэўненасць, што савецкія кампазітары створаць новыя высокамастацкія творы, якія дастойна адлюструюць веліч і гераізм эпохі стварэння камунізма.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА.

СХОД КІНАРАБОТНІКАЎ БЕЛАРУСІ

У Мінску 27—28 сакавіка праходзіў агульны сход работнікаў кінематаграфіі Савецкай Беларусі разам з шырокім творчым актывам сталіцы. Старшыня аргбюро Саюза работнікаў кінематаграфіі БССР народны артыст рэспублікі Ул. Корш-Саблін выступіў з дакладам на тэму: «XXII з'езд КПСС і задачы далейшага развіцця беларускага савецкага кінамастацтва». Дакладчык падрабязна расказаў аб рабоце студыі «Беларусьфільм» і Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў, ускрыў недахопы, якія яшчэ перашкаджаюць ствараць добрыя высокамастацкія кінакарціны.

У спрэчках прынялі ўдзел: пісьменнік М. Лужанін, кінадраматург і рэжысёр М. Фігуроўскі, аператар студыі «Беларусьфільм» Ул. Акуліч, драматург К. Губарэвіч, кінаакцёр В. Паначэўны, гукааператар К. Бак, кінарэжысёр Ул. Стральцоў, рэктар Усесаюзнага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі А. Грошаў, кандыдат філасофскіх навук Ф. Бондарава, рэжысёр Кіеўскай кінастудыі імя Даўжэнкі А. Швачко і аператар гэтай жа студыі М. Топчый, кінарэжысёры студыі «Беларусьфільм» Ул. Бычкоў, Р. Віктараў, В. Тураў, дацэнт Інстытута кінематаграфіі член мастацкага савета студыі «Масфільм» І. Маневіч, а таксама рэжысёр той жа студыі М. Швейцар. З вялікай прамовай выступіў міністр культуры БССР Р. Я. Кісялёў. У рабоце сходу кінаработнікаў рэспублікі ўдзельнічаў загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ М. Ф. Капіч.

КЛУБ СЯБРОЎ КІНО І КНІГІ

Увосень 1961 года ў Барысаве з'явіліся маляўнічыя лістоўкі. У правым кутку іх чырванела: «Да ведама гледачоў». Крыху ніжэй—наступны тэкст: «Кінатэатр «Радзіма» і Новабарысаўская гарадская бібліятэка пры садзеянні грамадскасці горада стварылі пры кінатэатры «Радзіма» клуб сяброў кіно і кнігі». Далей лаканічна гаварылася пра мэты і задачы клуба, выказвалася просьба, каб кожны барысаўчанін, які любіць кіно і кнігу, прыняў актыўны ўдзел у рабоце клуба.

Прайшло нямнога часу. Але ўжо можна ўпэўнена сказаць: клуб заваяваў вялікую папулярнасць у жыхароў горада і раёна. За кароткі час клуб сяброў арганізаваў нямала літаратурных вечароў, абмеркаванняў кінафільмаў, кніг, сустрэч з творчымі работнікамі.

Вось, скажам, у адзін са студзеньскіх дзён жыхары Барысава разам з газетамі і пісьмамі атрымалі запрашальны білет. «Паважаны таварыш! — гаварылася ў ім. — Вы прачыталі кнігу Галіны Нікалаевай «Бітва ў дарозе». Па матывах гэтага рамана пастаўлен двухсерыйны фільм, які будзе дэманстравацца ў кінатэатры «Радзіма» з восьмага студзеня 1962 года. Савет сяброў кіно і кнігі запрашае Вас і вашу сям'ю прагледзець гэты фільм. Па прад'яўленню гэтай паштоўкі Вы можаце атрымаць у касе кінатэатра два білеты без чаргі». Ну, як тут не пойдзеш у кіно?

Надышлі школьныя зімнія канікулы. І савет клуба рассылае праз сваіх актывістаў запрашэнне і праграму кінафільмаў, спецыяльна падабраных для дзяцей. Пры гэтым не забывае павіншаваць юных грамадзян з Новым годам, пажадаць ім вучыцца на выдатна і весела адпачываць у новым годзе. Члены клуба паклапаціліся аб школьніках, разам з гаркомам камсамола арганізавалі перад пачаткам кінасеансаў выступленні дзіцячай мастацкай самадзейнасці, гутаркі, кніжныя агляды.

Да маладога пакалення ў актывістаў барысаўскага клуба асаблівая ўвага. Так, савет клуба арганізаваў пры кінатэатры «Мір» юнацкі кінатэатр «Спадарожнік», які цалкам працуе па прынцыпу самаабслугоўвання. Дзеці самі выконваюць тут абавязкі кінамеханіка, адміністратара, мастака. Працуюць яны з вялікім энтузіязмам.

Клуб садзейнічае ўмацаванню кантактаў паміж бацькамі і школай. Пры кінатэатры «Мір» створаны бацькоўскі кіналекторый, дзе чытаюцца лекцыі пра маральны кодэкс будаўніка камунізма, а таксама па іншых раздзелах новай Праграмы партыі. Лекцыі ілюструюцца дакументальнымі і хранікальнымі фільмамі.

Вядзе «Клуб сяброў» і ідэалагічную барацьбу з рэлігіяй.

Шмат дыскусій, вечароў пытанняў і адказаў, вусных часопісаў праводзяцца клубам сяброў кіно і кнігі. І ўсё гэта — дзякуючы энтузіястам-актывістам — дырэктару кінатэатра «Радзіма» т. Русінаву, пенсіяру т. Бялтову, работніцы шклозавода т. Уткінай, работніцы завода «Чырвоны металіст» т. Рыклінай, загадчыцы гарадской бібліятэкі т. Гурэвіч, тэхнаруку т. Барадушку, лектару гаркома партыі т. Важэнінай і іншым. Усе гэтыя людзі— члены савета клуба, падзеленага на тры сектары: кінамастацтва, літаратуры і арганізацыйны. Работа савета плануецца, у канцы кожнага месяца кіраўнікі сектараў робяць справаздачу аб выкананні запланаваных мерапрыемстваў.

Сёлета ў бібліятэкі і кінатэатра стала яшчэ больш сяброў — чытачоў і кінагледачоў. А галоўнае—у «Клуба сяброў» ёсць дасягненні, якія не так проста вымераць, іх не ўкладзеш ні ў якія лічбы і працэнты. Гэта — ўплыў на рост камуністычнай свядомасці працоўных, выхаванне ў іх патрыятычнага гонару за нашу Радзіму, партыю, народ, новых адносін чалавека да чалавека, да грамадства, да калектыву.

Бясспрэчна, вопыт работы барысаўскага клуба сяброў кіно і кнігі варты шырокага пераймання.

Л. ГАЛІНІН.

НА ФОРУМЕ САВЕЦКАЙ МУЗЫКІ

Выхоўваць высокую культуру пачуццяў новага чалавека, ствараць узнёслую музыку камуністычнага заўтра — гэты натхняючы заклік партыі стаў галоўным зместам гарачай размовы, якая разгарнулася на Трэцім Усесаюзным з'ездзе кампазітараў СССР.

Удзельнікі з'езда дзякуюць партыі за сардэчныя словы прывітання ЦК КПСС дэлегатам і ўсім дзеячам многанацыянальнай савецкай музычнай культуры.

Неабходна цвёрда адстайваць прынцыпы мастацтва сацыялістычнага рэалізму, настойліва змагацца супраць праяў рэакцыйнай буржуазнай ідэалогіі як у галіне музычнай творчасці, так і ў галіне тэарэтычнай і эстэтычнай думкі. Пра гэта гаварылася ў многіх выступленнях на з'ездзе.

Кампазітар В. Мурадэлі лічыць, што важнейшай умовай росквіту камуністычнага мастацтва з'яўляецца ўзаемаўзбагачэнне братніх культур савецкіх народаў на аснове шырокага выкарыстання лепшых узораў прафесіянальнай і народнай творчасці. Думку аб вялікім значэнні дружбы народаў, якія будуюць камунізм, для новага ўздыму музычнай культуры СССР выказалі таксама К. Данькевіч, Г. Жубанаў.

Пра тое, якую шкоду прынеслі развіццю савецкай музыкі культ асобы, дыктатура густу аднаго чалавека і прыніжэнне ролі калектыўнай грамадскай думкі аб творах, усхвалявана гаварыў у сваім выступленні М. Чулакі. Новая Праграма партыі, сказаў ён, пастановы XXII з'езда КПСС даюць шырокі прастор для праяўлення творчай ініцыятывы ў развіцці форм, стыляў і жанраў сацыялістычнага рэалізму.

Многія прамовы былі прасякнуты клопатам аб глыбокім увасабленні сучаснай тэмы ў операх і балетах, у сімфанічна-аратарыяльнай і камернай творчасці.

— Аднак галоўнае тут, — сказаў Э. Кап, — не ўмельства кампазітара пры дапамозе тэхнічных прыёмаў і гукавых камбінацый ствараць вонкава эфектнае гучанне, а тое, наколькі ярка, жыццесцвярджальна і праўдзіва адлюстраваў ён новае, што з'явілася ў нашай рэчаіснасці.

Вялікая ўвага была аддадзена прапагандзе песні, харавой музыкі, гераічнай тэме (выступленні А. Анісімава, А. Пахмутавай, генерал-маёра Е. Вастокава і інш.).

Адзначалася, што ў песенным рэпертуары вакалістаў і калектываў мастацкай самадзейнасці вельмі многа лірычных твораў, якія часта не ўзнімаюцца вышэй мяшчанскага густу. У такіх песнях прымітыўныя і музыка і тэксты. Вельмі мала яшчэ пішуць кампазітары гераічных песень.

Кампазітар Ф. Лукін прапанаваў, у мэтах лепшай папулярызацыі здабыткаў музыкі народаў СССР, сістэматычна наладжваць у розных гарадах краіны фестывалі, дэкады, якія будуць спрыяць узбагачэнню савецкай многанацыянальнай культуры.

Тэма выхавання кампазітарскай моладзі старэйшымі майстрамі, яе ролі ў стварэнні камуністычнага мастацтва заняла пачэснае месца на форуме. У дакладзе Ц. Хрэннікава сярод здольнай моладзі былі названы беларускія кампазітары Я. Глебаў, Ю. Семяняка. Д. Смольскі, Р. Бутвілоўскі і Ул. Чараднічэнка.

З прамовамі выступілі таксама кампазітары Я. Цікоцкі, А. Хачатуран, Г. Майбарада, Кара-Караеў, П. Гайдамака, Д. Гершфельд, старшыня рэвізінай камісіі Г. Дамбаеў В. Габалін, А. Несцераў, Э. Бальсіс, Д. Шастаковіч, В. Багданаў-Беразоўскі і іншыя.

Старшыня мандатнай камісіі В. Уласаў паведаміў, што Саюз кампазітараў аб'ядноўвае цяпер 1 402 кампазітараў і музыказнаўцаў, якія выбралі на Усесаюзны з'езд 481 дэлегата, гэта —прадстаўнікі 32 нацыянальнасцей.

Прысутнічаюць замежныя госці — дэлегацыі музыкантаў краін народнай дэмакратыі. Прыехалі таксама музычныя дзеячы Югаславіі, Бельгіі, Нарвегіі, Фінляндыі, Францыі, Японіі, Злучаных Штатаў Амерыкі.

У вячэрні час дэлегаты і госці слухаюць новыя творы кампазітараў, якія атрымалі шырокае прызнанне народа.

Былі выкананы Дванаццатая сімфонія Д. Шастаковіча і Дзевятая сімфонія Я. Іванова, оперы Б. Макраусава «Чапай» і О. Тактакішвілі «Міндзія», вакальна-сімфанічная паэма А. Аруцюняна «Сказ аб армянскім народзе» і Другі фартэпіянны канцэрт С. Насідзе, «Патэтычная араторыя» Г. Свірыдава, арыі з опер С. Бабаева, С. Юдакова і іншыя творы.

Шчырая размова пра надзённыя праблемы развіцця савецкай музыкі і паглыбленне яе сувязі з жыццём народа раскрывае новыя шляхі ўзбагачэння мастацкай культуры нашага народа.

ТВОРЧАСЦЬ

Ці ідзе гаворка пра вялікія адкрыцці, ці пра штодзённую працу, — калі ў чалавека б'ецца творчая жылка, жыццё яго заўсёды будзе цікавым.

Вось такой штодзённай творчасцю захоплена Рыта Дабравольская — малады інжынер-канструктар аддзела галоўнага тэхнолага Мінскага радыёзавода. Яе галіна— штампы і прыстасаванні. Іх трэба паляпшаць, удасканальваць, каб палегчылася праца рабочых, расла прадукцыйнасць, паляпшалася якасць вырабаў. І Рыта шукае, вынаходзіць. Нядаўна на заводзе стварылі новы выдатны тэлекамбайн «Беларусь-110». Разам з таварышамі і Рыце давялося нямала падумаць над тэхналогіяй яго вытворчасці. Яна распрацавала новую канструкцыю штампа і яго адзначылі як каштоўную рацыяналізатарскую прапанову.

Фота В. БАРАНОЎСКАГА.

ТОЛЬКІ НА ПОЎНУЮ СІЛУ!

Працягваем размову аб тэатральным мастацтве.

Пра грамадзянскую адказнасць мастака, пра пошукі новага стылю выказвае свае думкі драматург і рэжысёр І. Лакштанаў.

Наступнымі выступаюць артыст Магілёўскага абласнога тэатра М. Казінін і журналіст А. Гарэлік (Бабруйск).

І. ЛАКШТАНАЎ.

ЗАСЛОНА закрылася. Спектакль закончаны. Гледачы спяшаюцца ў гардэроб. І тут нараджаецца першая, самая непасрэдная рэцэнзія на новы тэатральны твор. Яна складаецца з добразычлівай разважлівасці або раздражнёнай безапеляцыйнасці меркаванняў, з характэрнага выразу твараў, з асобных рэплік. І нават самае неспрактыкаванае вуха пачуе, ці ўзрушыў спектакль людзей, «прайшоў» ён ці не.

На гэты раз спектакль, бязумоўна, «прайшоў». Святочнае ажыўленне адчувалася ў фае, дзе электрыкі не спяшаліся гасіць святло (таксама добрая адзнака!), павольна змяншалася чарга ля вешалак.

Аднак два пажылыя мужчыны, якія стаялі перада мною, былі незразумела маўклівымі. Калі яны, узяўшы паліто, павярнуліся, я заўважыў на іх тварах глыбокі роздум.

— Смелая рэч, — сказаў адзін з іх.

— Так... — застыўшы з паўсагнутаю рукою над рукавом, дадаў другі. — Толькі... каб гэта ў свой час!

— Нічога. Усё роўна — моцна сказана.

Такая разважлівая пара ў артыкуле як журналісцкі прыём — не новая. І я дазволіў сабе запісаць яе дыялог толькі таму, што ў дадзеным выпадку так было на самой справе. Адбылося гэта пасля «Крыніц» Ю. Шчарбакова і І. Шамякіна, спектакля, які быў паказаны ў Мінску Тэатрам імя Якуба Коласа. Бадай, пакуль што гэта самы значны, самы «сталічны» спектакль сезона, хоць ён і прыехаў да нас з Віцебска.

Што ж зрабіла спектакль такім?

Звернемся да кароценькага дыялогу маіх гледачоў. Яны гаварылі аб творчай смеласці пастаноўшчыкаў і ўдзельнікаў спектакля — відаць, і ідэйнай, і мастацкай, — аб большай ці меншай надзённасці яго. А словы «моцна сказана» я расшыфраваў для сябе як напоўненасць акцёрскага жыцця жывымі пачуццямі, паўнакроўнасцю сцэнічнай дзеі. Значыць, вось што захапляе людзей, вось што для іх каштоўна.

Я пачаў гутарку пра «Крыніцы» не з мэтай рэцэнзаваць спектакль — гэта ўжо даўно і шырока зроблена — і, зразумела, не для таго, каб павучальна сцвердзіць яго ў якасці нейкага эталону. Проста — уражанне аб ім свежае, моцнае, і пытанні, якія я хачу закрануць, будуць выглядаць, відавочна, больш пераканальна ў канкрэтным іх вырашэнні.

ЗДАВАЛАСЯ Б, само сабой зразумела, што ствараць нешта новае — добра, гэта неабходная якасць усялякай сапраўднай творчасці. Новае можа быць вельмі прыкметным, відавочным, а можа выспяваць, накапляцца ў старым і паступова пераводзіць яго ў новую якасць. Але гэта — сама прырода творчасці, няспынны працэс, а не кампанія. А ў практыцы жыцця мы часта сутыкаемся з вульгарызацыяй разумення наватарства, з ператварэннем яго ў нейкую «моду».

Не магу забыцца на тое, як здольны кінарэжысёр з сумам і заклапочана казаў мне: «Пакутую над сцэнарыем. Патрабуюць — здымай па-новаму. А як?»

Я мімаволі ўспомніў Цецерава з «Мяшчан». Пераканаўча, па-горкаўску ён сказаў распеўным басам: «Наўмысля арыгінальным не будзеш. Я прабаваў».

А многія кінуліся ў наватарства іменна наўмысля, без унутранай патрэбы, без мастацкай для сябе неабходнасці. І гэтым хутка дасягнулі адваротных вынікаў.

З гэтага не варта рабіць павярхоўнага вываду, быццам я абараняю руціну, творчую ленасць. Але вопыт жыцця пераконвае нас у тым, што калі ў мітусні ўсялякай перабудовы наступае некаторая яснасць, мы зноў бачым тую ж пераможцу, што і ва ўсіх ранейшых творчых спрэчках, — магутную праўду жыцця. Новыя мастакі новым людзям расказваюць яе па-новаму, але робяць гэта натуральна і непрадузята.

Я не збіраюся выдаваць гэтыя думкі за свае. Іх даўно ўжо выказаў Трэплеў у «Чайцы»: «Так, я ўсё больш і больш прыходжу да пераканання, што справа не ў старых і не ў новых формах, а ў тым, што чалавек піша (ставіць, іграе. — І. Л.), не думаючы ні пра якія формы, піша таму, што гэта свабодна льецца з душы». Так думаў Чэхаў. А ці ж не яму было разумець сэнс наватарства?

Зноў звернемся да «Крыніц». Арыгінальная, новая пастаноўка па форме? Так. Наўмысная гэтая арыгінальнасць? Не. Яна вынікае з самога строю драматургічнага матэрыялу.

Інсцэніроўка зроблена без імкнення дамагчыся закончаных актаў. Яна яўна фрагментарная. І гэта поўнасцю раскрыта прасторавым вырашэннем. Эпізоды адзін за адным імкліва наплываюць па кругу, з'яўляючыся заўсёды з аднаго боку і знікаючы з другога, падкрэсліваючы гэтым рухам няспыннасць дзеяння. Так нават тэхнічныя элементы сцэны можна прымусіць працаваць на паглыбленне думкі спектакля.

А па зместу спектакль новы?

Так. Ідэі, вобразы ў многім самабытныя. Ужо знаёмае паглыблена ці ўгледжана з іншага боку. І пры ўсім тым у спектаклі няма ніякай дэкларацыйнасці; ён такі таму, што пры дадзеным літаратурным матэрыяле, дадзенай індывідуальнасці рэжысёра і пры гэтым акцёрскім складзе ён толькі такі і павінен быў атрымацца.

З усяго сказанага мне хочацца зрабіць просты вывад: клопаты аб новым у творчасці, выказаныя ў партыйных дакументах, у дыскусіях, у артыкулах — гэта заклік да творчай актыўнасці, творчага неспакою, а не да таго, каб тварыць абавязкова не так, як раней.

НЕ МЕНШ ВАЖНЫМ і своечасовым быў напамінак партыі аб павароце да сучаснай тэмы. Тэатру гэта было неабходна, бадай што, у большай ступені, чым усім іншым відам мастацтва.

Самым простым чынам, праз касу, праз наведванне спектакляў высветлілася, што сярод класікі трэба многа перагледзець, шукаць новыя ключы да яе раскрыцця, што хоць гераіцы рэвалюцыйнага мінулага і Айчыннай вайны народ і аддае неабходную даніну, — найлепшы водгук знаходзяць спектаклі, у якіх адлюстравана сённяшняе жыццё, яго хвалюючыя праблемы, яго радасці і трывогі.

І ў гэтым не малая, калі не галоўная, прычына поспеху «Крыніц». Смеласць думкі аўтара, усхваляванае і пераканальнае ўвасабленне п'есы тэатрам — галоўная вартасць спектакля.

І тут я не зусім пагаджуся з думкаю майго гледача. Памятаеце, ён сказаў: «Каб гэта ў свой час!»

Я ўяўляю, куды была накіравана яго думка: да пытання аб кульце асобы, які з вялікай сілай асуджэння выкрыты спектаклем. Але, папершае, буйныя мастацкія формы, патрабуючы часу на сваё стварэнне, не могуць і не павінны быць толькі надзённымі — гэта агульнавядома. Сучаснасць — разуменне больш шырокае. Па-другое, пытанне аб кульце яшчэ не стала здабыткам гісторыі. Інерцыя шматгадовага ўплыву культу асобы далёка яшчэ не спынена і часта дае сябе адчуваць. Гэта і робіць спектакль не пасіўным «адлюстраваннем» вельмі важнага павароту ў жыцці, а актыўным удзельнікам той вялізарнай нястомнай дзейнасці, якую ажыццяўляе цяпер партыя.

Аднак, ёсць у выпадковай рэпліцы, кінутай у тэатральным гардэробе, і вялікая доля праўды. Толькі б я гэты дакор аднёс не да мінулага — яно было занадта ўскладнёна ўсё тым жа культам, а зрабіў бы яго пажаданнем для сучаснага і будучага — пісаць аб тым, што хвалюе цяпер, паспрабаваць падказаць вырашэнне тых ці іншых праблем, не чакаючы, пакуль гэта будзе зроблена самім жыццём ды яшчэ замацуецца ў пэўных дакументах. Быць уладаром дум, а не мастацкім пратакалістам падзей! Тады сцвердзіцца адна з галоўных рысаў нашай творчасці — грамадзянскасць...

НЕКАЛЬКІ слоў аб стылі. Можа б, я і не пісаў іх, калі б не адно выказванне такога аўтарытэтнага рэжысёра, як Георгій Таўстаногаў. У сваім выступленні ў Ленінградскім аддзяленні Усерасійскага тэатральнага таварыства ён сцвярджаў, што сучасны стыль— гэта лаканізм. З гэтым можна было б пагадзіцца без спрэчак, калі б прыклад, які ён прывёў, не звужаў і не спрашчаў гэтага разумення. Лаканізм як стыль можна прыняць

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Брэсцкія аматары літаратуры любяць наведваць кніжны магазін № 12. Тут добра наладжана прапаганда літаратуры. 130 юнакоў і дзяўчат распаўсюджваюць кнігі на грамадскіх асновах. Па выніках агляду кніжных магазінаў рэспублікі за мінулы год кнігарні № 12 прысуджана званне «Лепшы кніжны магазін рэспублікі».

Фотакарэспандэнт М. Мінковіч зняў наведвальнікаў магазіна ў аддзеле масава-палітычнай літаратуры.

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

У выдавецтве Акадэміі навук БССР да 80-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы выходзіць з друку падрыхтаваны Літаратурным музеем Янкі Купалы зборнік «Народны паэт Беларусі», дзе змешчаны даследчыя працы, успаміны сучаснікаў, выказванні пісьменнікаў, грамадскіх дзеячоў, вучоных.

Некаторыя матэрыялы зборніка публікуюцца ўпершыню. Сярод іх—артыкул С. Новіка-Пяюна, які мы друкуем з нязначнымі скарачэннямі.

С. НОВІК-ПЯЮН

НЕЗАБЫЎНАЕ

Імя народнага паэта Беларусі Янкі Купалы для нас, жыхароў былой Заходняй Беларусі, было сцягам у барацьбе за вызваленне з-пад белапольскай акупацыі і ўз'яднанне ў адзіную Савецкую дзяржаву.

Нягледзячы на забарону польскай паліцыі, беларусы чыталі і распаўсюджвалі творы сваіх пісьменнікаў, перш за ўсё Янкі Купалы і Якуба Коласа; іх партрэты можна было бачыць не толькі ў гуртках Таварыства беларускай школы, але і ў прыватных памяшканнях. У мяне таксама віселі партрэты Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Францішка Багушэвіча і Цёткі.

На вечарах, якія наладжваліся вясковай і гарадской моладдзю, дзяўчаты і хлопцы з захапленнем дэкламавалі палымяныя вершы нашых любімых песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа, спявалі песні на іх словы. З гэтымі песнямі на вуснах ішлі беларускія патрыёты ў польскія турмы, ссылку, на здзекі і катаванні; яны дапамагалі нам зносіць пакуты бязрадаснага жыцця. Мы памяталі заклік Янкі Купалы:

Падымайся з нізін, сакаліна сям'я,
Над крыжамі бацькоў, над нягодамі!
Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі!

Першай кніжкай Янкі Купалы, якую мне давялося ўбачыць увосень 1920 года, была яго «Жалейка», выдадзеная ў 1908 годзе ў Пецярбургу суполкай «Загляне сонца і ў наша аконца».

Я вучыўся ў Нясвіжскай рускай гімназіі. Неяк я ішоў з Нясвіжа ў родную вёску Лявонавічы разам са школьным таварышам Янкам Ляхам і яго братам Якубам. Якуб і кажа:

— Хлопцы! Як увойдзем у лес, я вам пакажу нешта!

Мы зацікавіліся і шпарчэй пайшлі да лесу. Якуб дастаў з-за пазухі тоненькую кніжачку з надпісам «Жалейка» і ўсю дарогу чытаў Купалавы вершы. Гэта была мая першая «сустрэча» з Янкам Купалам, з якім я не разлучаўся ў далейшым сваім жыцці.

У роднай маёй вёсцы цётка Стэфа Шынгель падаравала мне чатыры кніжкі на беларускай мове (у тым ліку і «Жалейку»), якія прынесла ад свайго брата з Слуцка.

У 1926 годзе за арганізацыю беларускіх тайных школ, за пастаноўкі беларускіх спектакляў, за стварэнне і кіраўніцтва беларускім хорам у роднай вёсцы Лявонавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці (хор існуе да гэтага часу пад назвай «Лявонавіцкі народны хор») я быў асуджан польскімі ўладамі на пяць год ссылкі на Паможа, дзе прабыў да канца чэрвеня 1931 года.

У час вобыску ў хаце майго бацькі ў сувязі з маім арыштам паліцыянты крычалі, паказваючы на партрэты Янкі Купалы і Якуба Коласа:

— Пся крэў! Бунтаўшчык! Панавешваў у хаце партрэты камуністаў!

Надышоў гістарычны дзень 17 верасня 1939 года, у які браты з Усходу прынеслі нам вызваленне.

Дзень 14 лістапада 1939 года выдаўся шэры. З неба імжыў дробны дождж. Заходняя Беларусь, вызваленая Савецкай Арміяй ад белапольскай акупацыі, жыла новым жыццём. Толькі што прагучаў у Беластоку на Народным сходзе голас прадстаўнікоў беларускага народа, выказваючы яго волю аб уз'яднанні Заходняй Беларусі і Усходняй у адзіную дзяржаву.

Слонімскі павятовы выканаўчы камітэт змяшчаўся ў былым будынку манастыра, дзе пры панскай Польшчы было староства.

Я сядзеў у памяшканні павятовага аддзела асветы і пісаў верш «Свой голас аддам за Саветы» для слонімскай раённай газеты «Вольная праца». Пастукалі ў дзверы, і ў пакой увайшоў пажылы чалавек у шэрым капелюшы і чорным паліто з блакітным шалікам на шыі.

— Добры дзень! — сказаў ён, здымаючы галошы.

— Добры дзень! — адказаў я і аж аслупянеў ад нечаканасці. Перада мною стаяў Янка Купала. Яго я добра ведаў па партрэтах, якія змяшчаліся ў кніжках віленскага выдання.

— У Слоніме калісь жыў паэт-нашанівец Гальяш Леўчык, — гаварыў чалавек. — Ці вы не ведаеце: жыве ён, ці не? А калі жыве, дык ці не можаце мне даць яго адрас? Я — Янка Купала.

— Гальяш Леўчык жыве! Я вас адразу пазнаў! — усхвалявана сказаў я.

— Адкуль жа вы мяне ведаеце? — здзівіўся Янка Купала.

— А я маю ваш партрэт!

— Мой партрэт? Дык ён жа быў у панскай Польшчы забаронены!

— А я меў.

— Ды хто ж вы?.. О! Верш пішаце! Хто ж вы?

— Я Сяргей Новік, — крыху збянтэжана адказаў я.

— Вельмі прыемна! — прамовіў Янка Купала, паціскаючы мне руку. Пасля ён узяў мой верш, прачытаў і сказаў:

— Добра!

Потым дадаў:

— А тут жа напісана «Сяргей Пяюн».

— Гэта мой псеўданім...

— Вось яно што!.. Дык вы мне адрас Гальяша Леўчыка дасцё?

— А я вас завяду да яго. Пойдзем!

— Не пойдзем, а паедзем. Я ж машыну маю!

Я растлумачыў шафёру, як ехаць, і машына рушыла з месца.

— Цяпер, Сяргей, ты можаш пісаць і друкавацца пад сваім прозвішчам! Паноў няма і хавацца няма чаго! Даўно друкуешся?

— З 1926 года.

— А, дык значыць цябе ведаюць як Пяюна! Тады іншая справа!.. Але найлепш пішы пад сваім прозвішчам!

— Вось тут і жыве Гальяш Леўчык, — сказаў я. Машына спынілася на вуліцы Чырвонаармейскай каля дома № 73.

Янка Купала і я выйшлі з машыны і накіраваліся на панадворак. З маленькага доміка выйшаў сівы кучаравы чалавек. Прыклаўшы далонь да ілба, як ад сонца, ён прыглядаўся да Янкі Купалы.

Я крыкнуў:

— Добры дзень, дзядзька Гальяш! Прымай госця!

— Хто ж гэта?!

— Наш народны паэт Янка Купала!

Радасныя воклічы вырваліся з грудзей паэтаў.

— Добры дзень, Гальяш!

— Добры дзень, Янка!

Набліжаліся адзін да другога сябры, раскінуўшы для абдымкаў рукі і, нарэшце, абняліся і моцна пацалаваліся. Янка Купала пакалашмаціў рукою сівыя валасы Гальяша Леўчыка і сказаў:

— Ой, Гальяш! Які ты бландзін зрабіўся!

— А ты? — у сваю чаргу спытаў Гальяш і прыўзняў капялюш Янкі Купалы.

— У Савецкім Саюзе не сівеюць!

— Ну, дык заходзьце ў хату! Але даруйце, што трохі цесна ў мяне.

— Якое там «трохі»! Зусім няма як прайсці! — смеючыся пажартаваў Янка Купала.

Пакойчык, у які мы ўвайшлі, нагадваў маленькую залу нейкага музея. Усе сцены былі пазавешаны малюнкамі ў пазалочаных рамачках, фатаграфіямі, сярод якіх быў вялізны партрэт самога Гальяша работы мастака. Шмат было тут розных беларускіх кніжак, здымкаў. (Домік Гальяша захаваўся дагэтуль. Сам ён быў расстраляны нямецкімі фашыстамі ў 1941 годзе).

Янка Купала сеў на канапу.

— Ну як жывеш, Гальяш?

— Як жыву?.. Бульба ёсць, запалкі ёсць! Вось так і жыву.

— А памятаеш, Гальяш, як мы з табой у рэдакцыі «Нашай нівы» жылі? Газеты пад галаву, газетай накрыемся ды так і спім. А памятаеш, як мы ад царскіх жандараў хаваліся?

— А як жа, памятаю! Ну, а як ты жывеш, Янка?

— Прыедзеш да мяне, сам пабачыш. А цяпер мне пара ехаць, бо да вечара я мушу быць у Мінску. Гэта я, едучы з Беластока, з Народнага сходу, спецыяльна заехаў, каб цябе наведаць. Ну, бывай, Гальяш!

І яны пацалаваліся. Машына паімчала нас у горад.

— Дзе б нам паабедаць, Сяргей? — спытаў Янка Купала.

— У хаце ў мяне нічога няма. Прыйдзецца ехаць у рэстаран.

Мы паехалі ў «першы беларускі рэстаран», які знаходзіўся тады ў будынку цяперашняга Слонімскага райвыканкома. У хуткім часе нам падалі абед. Глянуўшы на мой бледны твар, Янка Купала спачувальна сказаў:

— Ой, Сяргей, Сяргей, і благі ж ты! Вось што зрабілі з табою паны!.. Фатаграфію сваю маеш?

— Маю!

— Падпішы мне!

Дырэктар рэстарана прынёс бутэлечку, у якой было трохі чарніла.

— Што ж гэта? Вы і чарніла не маеце? — дакорліва сказаў Янка Купала.

Сваю фатаграфію я падпісаў так: «Дарагому, любімаму народнаму паэту Беларусі Янку Купалу на шчыры ўспамін — удзячны Сяргей Новік (Сяргей Пяюн). Слонім, 14/Х 1939 г.».

— А я табе сваю дам тады, як прыедзеш да мяне ў госці. Я прышлю табе запрашэнне на з'езд пісьменнікаў!

У маім блакноце Янка Купала напісаў: «Міламу Сяргею Пяюну падчас сустрэчы ў Слоніме. Янка Купала. 14/Х 1939 г.».

Я расказаў Янку Купалу, што маю польскую літаратурную газету «Сыгналы», у адным з нумароў якой гаварылася і аб літаратуры і культуры беларускай, былі змешчаны партрэты Георгія Скарыны, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка і іншых дзеячоў.

Янка Купала зацікавіўся гэтай газетай:

— Ці не мог бы ты, Сяргей, паказаць мне гэту газету? Вельмі цікава пабачыць.

— Не то, што паказаць, я вам яе зусім аддам!

— Праўда? А не шкада табе?

— Што вы!

— І вершы свае дай мне!

— Добра, я зараз пайду і прынясу!

Пасля абеда Янка Купала і я пайшлі ўздоўж вуліцы Міцкевіча (зараз Першамайская).

— Хто гэта? — пыталіся ў мяне знаёмыя.

— Янка Купала! — усхвалявана адказваў я.

Маланкаю абляцела гэта вестка ўсю вуліцу, паабапал якой натоўпам стаялі старыя і малыя. Яны радасна віталі дарагога песняра, якога ведалі толькі з партрэтаў ды з кніжак.

Трохі прайшоўшы, Янка Купала спытаў мяне:

— Ці ёсць тут кнігарні?

— Ёсць! Вось адна, а вось другая!

— Зойдзем!

Мы зайшлі ў кнігарню Рыпа.

— Добры дзень! Ці ёсць у вас беларускія кніжкі? — спытаў Янка Купала.

Кнігар Васер, усміхаючыся, сказаў:

— Пры панах афіцыяльна ў нашай кнігарні беларускіх кніжак не было, бо забаранялі прадаваць, дык мы... так... з-пад прылаўка...

— А адкуль вы бралі кніжкі?

Васер паказаў на мяне і сказаў:

— Гэта таварыш Новік дастаўляў нам беларускія кніжкі, а мы іх распаўсюджвалі.

— Што ж у вас ёсць?

Кнігар паказаў некалькі кніжак, якія яшчэ не паспеў прадаць. Янка Купала, глянуўшы на кніжкі, усклікнуў:

— О! І мая ёсць!

І ён любоўна пачаў глядзець зборнік сваіх вершаў «Шляхам жыцця», выдадзены Віленскім выдавецтвам.

— Добра выдалі! — сказаў Янка Купала. Затым паглядзеў «Вянок» Максіма Багдановіча, другое віленскае выданне, і іншыя кніжкі...

Мы выйшлі з кнігарні і накіраваліся да машыны. Па вуліцы Пушкіна праехалі да Агароднай і прыпыніліся каля дома № 8, дзе я жыў (гэты дом спалілі фашысты ў 1944 г.).

— А хто выканаў малюнкі да тваіх твораў? — спытаў Купала.

— Я сам.

— О, дык ты і мастак! Мушу цябе пазнаёміць са сваёй жонкай — яна цікавіцца і займаецца дзіцячымі выданнямі. Ну, Сяргей, сядай і пакажы нам на Мінск дарогу, а то позна! Трэба завідна да Мінска даехаць.

Я сеў у машыну і мы паехалі да канца Агароднай вуліцы, затым па Замкавай (цяпер Камсамольская) да вуліцы Маставой.

Тут Янка Купала папрасіў шафёра затрымаць машыну, і на развітанне прамовіў да мяне так:

— Прышлю табе, Сяргей, запрашэнне і ты прыедзеш да мяне абавязкова. Падарую табе сваю фатаграфію і свае кніжкі... Ну, бывай, Сяргей! Як у другі раз прыеду, пабуду даўжэй! — жартам у рыфму сказаў Янка Купала, абняў мяне, моцна пацалаваў і паціснуў руку. Я стаяў, як зачараваны, пакуль машына не знікла за мостам, што перакінуўся над Шчарай.

Праз некалькі дзён мне паведамілі, што на маё імя прыйшло пісьмо ад Янкі Купалы.

Янка Купала надрукаваў адзін мой верш «Мая песня» ў газеце «Літаратура і мастацтва», якая змясціла яго пад рубрыкай «Вершы паэтаў Заходняй Беларусі.

Не давялося мне больш убачыцца з Янкам Купалам. Але ў маёй памяці ён жыве, як быццам бачыў я яго толькі ўчора, а не дваццаць два гады назад: простым, сціплым і такім чалавечным.

Георгій КОЛАС

ЛЯ РОДНАЙ ХАТЫ

«Салігорскія дзённікі» журналіста Георгія Коласа, урывак з якіх мы сёння друкуем,—гэта вынік яго паездак да беларускіх шахтабудаўнікоў. Поўнасцю «Дзённікі» будуць змешчаны ў трэцяй кніжцы часопіса «Неман».

Малады загадчык навучальнай часткі тэхнікума адчуваў сябе ў перадэкзаменацыйнай мітусні, нібы рыба ў вадзе. Вынырнуўшы з адной групы людзей, ён адразу ж аказваўся зноў у акружэнні. Парывісты, радасны, лёгкі, ён на ляту адказваў на пытанні, сартаваў заявы, даведкі па папках.

— Вы з газеты? Я заняты, — катэгарычна ўсміхнуўся Яновіч.

— Я пачакаю.

— Што ж, пачакайце, — адказаў ён з той жа ўсмешкаю.

Я чакаў.

Пачалося першае пасяджэнне педагагічнага савета.

Дырэктар урачыста абвясціў:

— На парадку дня адно пытанне: пра допуск абітурыентаў да ўступных экзаменаў. Слова для інфармацыі мае Эдуард Сямёнавіч.

Той пачаў даклад, у тон дырэктару, афіцыйна, па форме, але з гарэзлівымі агеньчыкамі ў вачах, раз-пораз адкідваючы з твару цяжкую пасму валасоў:

— На васемнаццаць гадзін 25 кастрычніка пададзена заяў 207.

Усе рассмяяліся. Глянулі на гадзіннік. Ад тэрміну, які быў названы Яновічам, нас аддзяляла ўсяго шэсць мінут.

— Дакладнасць неабходна. Людзі са змен будуць ісці да паўночы. Заяў сёння ж будзе больш. Дакументы патрэбны? — звярнуўся ён да членаў камісіі. — Персанальна будзем разглядаць?

— Нясіце, — просіць сакратар парткома будоўлі Часлаў Казіміравіч Анцілеўскі. — Паглядзім «на выбарку», што за народ.

Яновіч выскачыў і ў момант вярнуўся з ахапкам рассартаваных дакументаў. Твар яго ззяў. Вочы з-пад акуляраў свяціліся гагарынскім бляскам. Белазубая ўсмешка падкрэслівала радасць. Здавалася, у ахапку Яновіч нясе не паперы, а вялізны букет, у якім кожны лісток — бутон або гронка кветак. А завуч удыхае іх водар, лікуючы, хмялеючы, гатовы ўсіх надарыць гэтым водарам і гэтым хмелем. Па тварах членаў педсавета і прысутных на пасяджэнні — старшыні гарсавета, камсамольскага і партыйнага сакратароў салігорскай будоўлі відаць, што ўсе яны падзяляюць радасць Яновіча.

— Што я казаў? — завуч пераможна акінуў позіркам выкладчыкаў. — Цяпер у калідоры мяне сустрэлі чалавек пятнаццаць. Прыбеглі здаваць дакументы...

— Добра, добра, няхай прыходзяць...

...Скончыўся педсавет. Яновіч зноў ад мяне выслізнуў, — да тых пятнаццаці (а іх ужо было куды больш), якія ў калідоры «прыбеглі здаваць заявы».

Мінула каля гадзіны.

— Ну-с, я да вашых паслуг. Толькі папярэджваю: часу ў мяне ў абрэз.

— Колькі мінут у маім распараджэнні?

Яновіч зірнуў на гадзіннік.

— Пятнаццаць мінут. Не больш.

«Што гэта — какецтва ці нелюбоў да журналістаў?» — падумалася мне. Гэтае пытанне я задаў Яновічу ўголас.

— Шчыра? — позірк яго з-пад акуляраў быў падобны на кароткі ўдар баксёра. — Не вельмі люблю. Маю падставы.

— Пра вас пісалі?

— Бывала.

— Дрэнна?

— Вельмі... Зрэшты, нязважна, — зноў адкідвае з твару цяжкую пасму Яновіч. — Чым магу быць карысны?

— Мяне цікавіць многае...

— Іменна?

— Вашы таварышы па змене імя XXII з'езда. Раскажыце пра іх.

— Гэта іншая размова, — з непадробным захапленнем прыўзняўся і зноў прысеў Яновіч. — Праўда, — глянуў зноў на гадзіннік, — за пятнаццаць мінут наўрад ці паспеем. Але не бяда. Што не паспеем сёння, адкладзём на заўтра.

...Мы прасядзелі з Яновічам не пятнаццаць мінут. Выходзілі з тэхнікума, калі калідоры ўжо апусцелі. Назаўтра я прабыў у яго ўвесь вечар і добрую частку ночы. Ад яго я даведаўся пра хлопцаў са змены многа такога, чаго ад іх саміх і дазнацца было немагчыма. Але, гаворачы пра сваіх таварышаў, Яновіч, натуральна, не мог не даць таго, што яны не здолелі і не паспелі мне расказаць пра яго. Жвавы і шчыры, ён з захапленнем жывапісаў працоўныя будні нядаўна пакінутага калектыву і, калі даводзілася гаварыць пра сябе, раптам спахапляўся, гарэзліва пагражаючы:

— Ну, глядзіце ў мяне! Вы мяне «завялі», «раскалолі». Калі чаго наманіце, будзе абвяржэнне.

* * *

— Не думаў і не гадаў я, што буду працаваць каля дому, каля хаты, — загадкава ўсміхаючыся, штосьці ўспамінае, пра штосьці марыць Эдуард. — Я ж тутэйшы, слуцкі... А хацеў далёка-далёка паехаць...

Так пачаў расказваць мне Эдуард аповесць свайго жыцця. Гэтая аповесць, магчыма, заслугоўвае раманічнага апісання. Я ж пастараюся яе апісаць вельмі коратка, магчыма, блытана, — так, як расказваў сам Эдуард.

...На старым, выцвілым фота — чатыры хлопчыкі ва ўзросце ад чатырох да шасці. Яны стаяць ля сцяны хлява. Аперазаныя кулямётнымі стужкамі, з кінжаламі і небутафорскімі пісталетамі.

Надпіс на адвароце:

«Маім юным партызанам Сеню, Валерыку і Эдуарду Яновічу на доўгі ўспамін аб партызанскай вайне.

Герой Савецкага Саюза І. Бельскі».

Гэта — пачатак аповесці. Зіма 1943 года.

— У мяне ж была нават пасада, — смяецца Эдуард. — Камандзір атрада. Але, самі разумееце, наш «атрад» у асноўным бульбу знішчаў... Маці — яна была сапраўднай партызанкай. Пра яе ёсць што расказаць... А вось, паглядзіце, фота. Мама.

З фатаграфіі глядзіць звычайны твар жанчыны. Але, відавочна, знешнасць падманлівая. Гэта чуецца і ў інтанацыі сына, які вымаўляе слова «мама» вельмі цёпла і беражна. Аб гэтым можна здагадацца, зірнуўшы на стэлажы, дзе літаратура рассартавана па класіфікацыі, вынайдзенай уласнікам бібліятэкі, з раздзеламі «Хімія», «Касманаўтыка» і г. д. Сярод іншых — раздзел з таблічкаю: «Есть женщины в русских селеньях...» У ім, у гэтым раздзеле, кніг не менш, чым у «Горнай справе» і любым іншым.

Эдуард расказвае далей.

— Пасля вайны я скончыў дзесяцігодку. Паехаў у Маскву. Дзядзька там у мяне, заслужаны чалавек, з гвардыі старых бальшавікоў. Сустрэў суроваю ласкай:

«Ну, што надумаў наш Ламаносаў? Куды паступаць збіраешся?»

Марыў я аб літаратуры.

«У пісьменнікі?! Шылам кашу есці?» — ашаломіў мяне дзядзька.

А ў мяне, — працягвае Эдуард, — ужо і дакументы пададзены, і нарыс мой прынялі, і даволі прыхільна.

«Дык ты пра што пісаць збіраешся? — дапытваўся дзядзька. — Ці ведаеш ты, колькі каштуе фунт ліха? Хлапчук, смаркач, а ў пісьменнікі. Хоць навучыся сяму-таму, жыцця панюхай як след, а потым пішы ўжо... Пісьме-е-ннік...»

Я спрабаваў яму даказаць, што, хоць і малады, і не масквіч, з-пад Слуцка, але, маўляў, таксама не лыкам шыты, у сім-тым разбіраюся. Спрачаліся да хрыпаты. Амаль усю ноч.

«Улічы, я табе, літаратару, пакуль будзеш вучыцца, ні капейкі не дам. І маці загадаю».

«Сам зараблю».

«Чым жа?»

«Буду пісаць».

«Вось-вось, — азваўся з'едлівым басам дзядзька. — У газеткі, значыць? Ну, дапусцім, прыйшоў ты ў рэдакцыю. Бачаць, студэнцік штаны прасядзеў. Злітаваліся, далі табе крыху зарабіць. І што ж ты ду-

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Трэці капёр Салігорска змяніў часовую «вопратку». Ва ўзлёце яго металічных канструкцый — не толькі прыгажосць, але і магутнасць. Расце выдача сільвініту нагара...

На 150—170 працэнтаў выконваюць нормы машыніст скрэпера Валянцін Букатаў (у цэнтры), бурыльшчыкі Леанід Галавач (злева) і Ілья Берген.

Фота П. Бародкі.

НА ЗАВОДСКАЙ СЦЭНЕ

Мінскія радыёзаводцы не раз сустракаліся ў сваім клубе з майстрамі мастацтва. Тут двойчы выступала Дзяржаўная харавая капэла пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Р. Шырмы. Сустракаліся радыёзаводцы з народным артыстам БССР Я. Палосіным, пісьменнікамі Ул. Карпавым, А. Вольскім.

А на гэты раз на заводскай сцэне выступілі майстры цырка на чале з заслужаным артыстам РСФСР Кіо. Калі на заводзе даведаліся аб тым, што прыехаў цырк, многія прыйшлі да загадчыка клуба:

— Дзе купіць білеты?

— Артысты даюць бясплатны канцэрт...

Пасля прывітальнага слова, якое зрабілі Кіо і яго сын Ігар, пачаўся канцэрт. Першымі выйшлі на сцэну акрабаты-эксцэнтрыкі Кулікоў і Язеў. Затым — акрабаты Місуновы, Людміла Снозе і Жураўлёў. Акрабатычныя нумары выклікалі захапленне рабочых.

А пакуль клоуны займалі гледачоў, работнікі сцэны хутка рыхтавалі ўсё неабходнае для наступных нумароў. Свае майстэрства паказалі артысты Кіо, жанглёр заслужаны артыст Азербайджанскай ССР Абдулаеў і іншыя.

Паказ праходзіў у суправаджэнні аркестра пад кіраўніцтвам Д. Сакалова.

Пасля канцэрта намеснік дырэктара завода А. Мамантаў падзякаваў усім артыстам і ад імя калектыву радыёзаводцаў падарыў Э. Кіо альбом з відамі беларускай рэспублікі.

Адміністрацыя і грамадскія арганізацыі завода ўзнагародзілі цыркавы калектыў Ганаровай граматай радыёзавода.

Ю. ЭСТРЫН.

ЭСТАФЕТА ПРЫГОЖЫХ СПРАЎ

Унукі Івана Віхрова

ПАЛЕСКІЯ лясы — наша гордасць, скарб і неацэннае багацце. Шмат вялося размоў аб разумным выкарыстанні гэтага багацця, аб неабходнасці больш плённа аднаўляць яго. І ўсё ж яшчэ мы не заўсёды як след цэнім свайго «зялёнага друга». Прыняты нядаўна закон аб ахове прыроды звернуты непасрэдна да сумлення кожнага грамадзяніна. Менавіта самі члены грамадства ў першую чаргу павінны берагчы і аднаўляць лясны скарб.

Цяпер усё часцей можна бачыць, як аматары прыроды мяняюць ружжо на дакладнае, «прыцэльнае» вочка фотаапарата альбо кінакамеры. Але мала быць пасіўным сузіральнікам. На лясных сцяжынках сустракаюцца людзі — сапраўдныя шчырыя гаспадары лесу. І хаця яны не маюць ніякага афіцыйнага дачынення да лясной службы, іх з поўнай падставай можна лічыць байцамі арміі залёнага фронту.

Пра аднаго з іх — дырэктара Караваціцкай сярэдняй школы Рэчыцкага раёна Івана Максімавіча Хамяка — мне хочацца расказаць.

ДУМКА аб школьным лясніцтве нарадзілася ў Івана Максімавіча яшчэ даўно. Два гады назад педсавет адзінадушна падтрымаў прапанову дырэктара, і калі ў школе было вывешана запрашэнне запісвацца ў гурток юных лесаводаў, на першыя ж заняткі гуртка з'явілася дваццаць пяць хлопчыкаў і дзяўчынак.

Тады ж Іван Максімавіч падрабязна расказаў ім аб плане работы гуртка. І галоўнае ў гэтым плане было: стаць юнымі гаспадарамі лясного багацця.

Так узнікла Караваціцкае школьнае лясніцтва. Вучні з пасведчаннямі леснікоў, дапамагаючы работнікам дзяржаўнага лясніцтва, пачалі рэгулярна рабіць абходы кварталаў, даглядаць і вырошчваць маладняк лесу, шчыра, з любоўю берагчы неацэннае багацце палескага краю. У школе з'явіліся свае лесатэхнікі, леснікі, інспектары па лясной ахове, фітафенолагі.

25 чалавек — вялікі атрад памочнікаў. І за два гады сваёй дзейнасці школьны атрад сяброў «зялёнага друга» прынёс вельмі многа карысці. Аб гэтым з гордасцю гавораць усе работнікі Караваціцкага лясніцтва. За гэты час тут не здарылася ніводнай самачыннай парубкі, нідзе не задыміўся лясны пажар. Юныя лесаводы заклалі школьны лесагадавальнік. Акрамя таго, сябры «зялёнага друга» праводзяць вялікую растлумачальную работу сярод насельніцтва.

Неўзабаве пасля прыняцця закона аб ахове прыроды я быў у Караваціцах.

Іван Максімавіч Хамяк сустрэў мяне здагадлівай усмешкай:

— Да нашых лесаводаў?

— Да іх.

— А вунь якраз рыхтуюцца яны да абходу. — Іван Максімавіч выглянуў у акно. — Станавіцеся на лыжы — і ў лес. Іншым часам я сам, хоць немалады ўжо, адпраўляюся на лыжах разам з хлопцамі. Думаў сёння праехацца па кварталах, ды часу не хапае, рыхтавацца да лекцыі трэба...

І вось я іду па лесе са строгім, гаспадарлівым старшым ляснічым Ванем Блізняцом і яго задумленым памочнікам Рыгоркам Крутым.

У абодвух іх праз плячо — мяшэчак. Сябрукі часта нагінаюцца долу, падымаюць сасновыя шышкі і, ўважліва агледзеўшы іх, кладуць у мяшэчак.

— На насенне збіраем, — тлумачыць Ваня Блізнец. — Ужо каля чатырохсот кілаграмаў ёсць. І ўсе здаровыя, добрыя шышкі! Вясной думаем расшырыць лесагадавальнік...

— А як дарослы лес даглядалі ўзімку? Не было, часам, самачынных парубак?

— Здарыўся адзін такі выпадак, — прыпамінае Ваня. — Праўда, чалавек той яшчэ не паспеў ссекчы дрэва. Але мы яго засталі з пілой і сякерай ля сасны... Пагутарылі па-мужчынску! Прасіўся, каб не гаварылі на вёсцы... Дык мы ўзялі з яго слова, што пасадзіць і выгадуе аж тры сасонкі...

— І пасадзіць?

— Абавязкова! — рашуча ўмешваецца ў гутарку Рыгорка Круты. — А не пасадзіць — мы самі зробім гэта. Каб чалавеку сорамна было...

Лыжны след вядзе далей па лясных лагчынах і ўзгорках. Хлопцы пільна аглядаюць ціхую баравую прастору, падбіраюць шышкі ды апавядаюць аб усіх справах свайго гуртка. Адчувалася, што ім знаёмы да драбніц усе мясціны свайго лясніцтва, што яны тут — сапраўдныя, разумныя гаспадары.

А потым школьныя лесаабходчыкі расказвалі пра свае планы на вясну. Нямала клопатаў прыбавіцца ў іх, як толькі растане снег у барах. Трэба будзе прыбраць лясныя кварталы ад ламачча, закласці яшчэ на некалькі сотках лесагадавальнік, правесці ў кожнай лясной вёсцы гутаркі з людзьмі...

І верылася — усё зробяць сябры «зялёнага друга». Той агеньчык любові да лясной бацькаўшчыны, што запалены ў іх сэрцах Іванам Максімавічам, не пагасне ніколі. Гэтая любоў — любоў вечназялёная...

У ВЕЧАРЫ таго ж дня людзі, што сабраліся ў Караваціцкім сельскім клубе, слухалі цікавую гутарку Івана Максімавіча аб нашых лясах. Нельга сказаць, што гэта была звычайная, «планавая» лекцыя. У кожным слове педагога адчувалася трапяткая душа чалавека, які літаральна жыве праблемамі далейшага лёсу «зялёнага друга», які разумее іх як праблемы вялікай дзяржаўнай важнасці. А гаварыў жа Іван Максімавіч, здаецца, пра зусім канкрэтнае, зямное: аб тым, што з прыходам вясны прыбаўляецца клопату ў лесаводаў і што гонар кожнага жыхара — быць актыўным памочнікам ва ўсіх справах лясной службы...

Міжволі ўспомнілася славутая «лекцыя аб лесе» з рамана Леаніда Лявонава «Рускі лес», і думалася аб караваціцкіх аматарах прыроды: вось яны, сыны і ўнукі Івана Віхрова!

Школьныя лясніцтвы — справа, вартая самага гарачага пераймання і падтрымкі. Калі летась у перадавым у рэспубліцы Васілевіцкім лягасе праходзіў семінар ляснічых Беларусі, удзельнікі яго наведалі і Караваціцкае школьнае лясніцтва. Пазнаёміўшыся з дзейнасцю лясніцтва, прыйшлі да вываду: гэта вельмі добра, гэта вельмі патрэбна. Што, калі ўсе школьнікі рэспублікі падхопяць слаўны пачын юных лесаводаў з Караваціч? Якая армія памочнікаў, гаспадароў лясного багацця будзе ў нас!..

Ды хіба толькі народнагаспадарчы сэнс мае гэтая праблема? А яе этычны, маральны бок? Безумоўна, што той, хто пройдзецца клапатлівым гаспадаром па лясных сцяжынках, — яшчэ больш палюбіць родны беларускі край, сваю лясную зямлю, якая пачынаецца адразу за школьным парогам. І гэта застанецца назаўжды як цяга да паэзіі, да мудрай думкі, да пяшчотнага пачуцця, да ўсяго светлага і прыгожага ў жыцці.

Эд. КАРПАЧОЎ.

ШЛЯХ ДА ВЫШЫНЬ

Р. БЯРОЗКІН.

С. Гаўрусёў. ШЧОДРАСЦЬ

Радавая, як кажуць, кніга, чарговы зборнік паэта. Але ўчытайцеся ў гэту кнігу больш-менш уважліва, і вы абавязкова заўважыце ў ёй нешта такое, што робіць [illegible] сімптаматычнай і паказальнай для нашай сучаснай паэзіі ў цэлым. Я гавару пра зборнік Сцяпана Гаўрусёва «Шчодрасць».

Прызнаемся шчыра: ужо надакучыла драбнюткая, аблегчаная «задушэўнасць» некаторых паэтаў, што вось ужо колькі год старанна адмерваюць кароценькую, у дзесяць крокаў, пратаптаную сцежку ад былінкі да травінкі, ад пралескі да пералеска — і назад.

Не, я зусім не хачу сказаць, быццам канчаткова вычарпала свае рэсурсы паэзія простых радасцей, што акружаюць чалавека: усходу і захаду сонца, ракі ў зорах і лесу ў павуцінні бабінага лета. Я толькі хачу падкрэсліць, што існуе непасрэдная сувязь паміж умельствам удумлівага, па-сапраўднаму сучаснага паэта пільна ўглядацца ва ўсё, што яго акружае, у шчодрае і маладое жыццё прыроды, з няменш цудоўным умельствам яго ж, паэта, расхінаць падрабязнасці, каб бачна было ва ўсе бакі, ва ўсю далечыню прасторы і часу...

Няцяжка заўважыць, што, пры ўсіх яе прыватных, а часам, і сур'ёзных недахопах, новая кніжка С. Гаўрусёва знаходзіцца ў відавочнай блізкасці да такіх з'яў нашай шматнацыянальнай паэзіі, як вершы Э. Межалайціса, армянскага паэта П. Севака, аўтара вельмі цікавай кніжкі «Чалавек на далоні» О. Вацыеціса, некаторых маладых украінскіх паэтаў. Гэта паэты розныя, непадобныя, але блізкія паміж сабой у намаганні ўзбуйніць рэчаіснасць, паказаць чалавека ў напружанні яго духоўных сіл, скіраваных на тое, каб усталяваць на зямлі бясхмарнае людское шчасце і вечны мір.

І не мае, як мне здаецца, вялікага **прынцыповага** значэння тое, што інтэлектуальны ўзровень, скажам, героя Э. Межалайціса намнога вышэйшы за ўзровень героя маладога беларускага паэта, што далягляды яго шырэйшыя. Зрэшты, яно і не магло быць інакш. Герой Межалайціса бачыў на ўласныя вочы попел Асвенціма і Хірасімы, ён сам быў актыўным удзельнікам тытанічнай барацьбы супраць фашызму, у той час як гаўрусёўскі герой належыць да пакалення людзей, чыё «маленства прайшло... пад грымотамі вайны».

Знамянальным і важным з'яўляецца якраз тое, што і гэты юнак, які мае жыццёвы вопыт значна бяднейшы за вопыт сталага паэтычнага майстра, засвоіў, зрабіў арганічна **сваім** найбольш істотнае ў светапоглядзе і светаадчуванні старэйшага пакалення савецкіх людзей, барацьбітоў за ўсечалавечае шчасце.

Калі ў адным са сваіх вершаў Гаўрусёў піша: «І нават лёгкі ўзмах тваёй рукі цяпер на ўзмах падобны багатырскі» (шкада, што паэт не зусім дакладна ўжывае слова «багатырскі», якое па-беларуску азначае нешта зусім іншае), а трохі ніжэй, не баючыся апынуцца ў палоне рытарычнай фразы, аднесці свайго равесніка да ліку «сонцападобных», дык гэтым ён адстойвае не проста права на шырокі рамантычны жэст, на паэтычную ўзнёсласць — ён адкрыта сцвярджае **высокае** разуменне Чалавека, зноў жа ўласцівае Межалайцісу альбо Севаку.

І глядзіце, як настойліва і паслядоўна, з верша ў верш, [illegible] Гаўрусёў гэты высокі, рамантычна-[illegible] погляд на свет!

Сонца ў Гаўрусёва вымярае чалавечыя сілы «на свой аршын» [illegible] — нечакана новы паварот старой тэмы, калі не чалавек глядзіць, як кажуць, сонцу ў вочы, шукаючы ў яго спагады, а наадварот, сонца ўглядаецца ў чалавека і ацэньвае яго, як нешта роўнае сабе самому.

Стомлены каваль выходзіць з кузні, і яму «шырокім горнам шуміць зара» — вобраз, не пазбаўлены традыцыйных рыс, але падпарадкаваны новаму маштабу вымярэння рэчаў і з'яў... Альбо такая карціна веснавой сяўбы:

> — Расці спарней! — і дзед з шырокай жмені
> Жытцо дажджом сыпнуў перад сабой,
> Ажно са звонам дзынкнулі прамені
> Ля самых ног...

Ёсць у гэтым збліжэнні сейбіта з сонцам нешта купалаўскае, памножанае, аднак, на сучаснае светаўспрыманне савецкага чалавека, які больш глыбока і поўна, чым калі-небудзь, адчувае сваю ўладу над прыродай. А ці сустракалася раней такая дэталь у вершы пра спякотны летні дзень:

> І душна так, што цень ад самалёта
> Спяшаецца дабегчы да вады.

Старое, звыклае, апетае неаднаразова раптам становіцца новым дзякуючы таму, што на яго глядзіць сучаснік — зямны чалавек з непераадольным імкненнем да вышыні. І лакалічнасць гэтага малюнка: самалёта цень, што шукае вады, — таксама сучасная, ад умельства бачыць свет буйна, рэльефна, я б нават сказаў, кінематаграфічна. Па меншай меры недарэчнай уяўляецца мне пазіцыя [illegible] значыць, і ў жыцці паэта.

Паэтычная думка Гаўрусёва крочыць шырока. Вобраз у лепшых вершах паэта перарастае рамкі адзінкавага, цалкам застаючыся пры гэтым на глебе жывой рэальнасці.

С. Гаўрусёў часта і многа піша пра гарматы, цень ад якіх падаў на яго, паэта, ранняе маленства. Зусім рэальная гармата, што стаяла недзе на ўскраіне сяла, а, можа, і пад самымі вокнамі бацькоўскай хаты, раптам, а па сутнасці вельмі заканамерна, набывае «калібр», непараўнана шырэйшы за свой фізічны, баявы калібр, і вось ужо, «як ствол пасля адкату, наперад» падаецца знявечаная вайной зямля. Які выразны і зноў жа які эканомны паэтычны вобраз! У лірычнай паэме «Штодзённы лістапад» С. Гаўрусёў яшчэ раз вяртаецца да гэтага вобраза-думкі, вобраза-абагульнення. Хлопчык, што «вырас пад расчахлёнай пашчай, пад агнём», узмужнеў, і сёння ён — артылерыст, салдат на далёкаўсходняй граніцы, а ціша граніцы — «не спагадней міны, што стоена чакае ў баразне, пакуль наедзе плуг...» Салдат на варце, а над ім

> Глядзіць з акопа ствол незачахлёны
> На хмары стометровай таўшчыні.

Каля гэтай мірнай гарматы адпачывае герой пасля таго, як ён разам з таварышамі патушыў пажар у тайзе (дарэчы, апісаны надзвычай ярка і экспрэсіўна), і гордае ўсведамленне салдата, што зроблена добрая чалавечая справа, што выратавана жыццё ад згубы і вынішчэння, як бы дае паэту права яшчэ раз і цяпер ужо зусім па-новаму крута і нечакана павярнуць патаемны «махавік» вобраза:

> Я адхінуў плячамі куст зялёны,
> Якім замаскіраван быў акоп, —
> Няхай гарматы ствол незачахлёны
> Шукае новых зор, як тэлескоп!

Сказана, як бачым, вельмі скупа і адначасова пра вельмі многае: нашы гарматы куды ахвотней глядзелі б у зорнае неба, чымся ў чалавечае сэрца! Адсюль, ад такога павароту тэмы і вобраза, ужо зусім блізка і да пакутлівага прызнання: «Я попел Хірасімы ўваскрашаю», і да грознай перасцярогі: «Бо і вайна, як і пажар таёжны, пачацца можа з іскаркі малой», і да публіцыстычна-дакладнага закліку: «Пільней жа зрок, сучаснікі...»

Гаўрусёўскія пераключэнні з вобраза ў вобраз, з рэальнага плана ў план шырокіх абагульненняў ажыццяўляюцца як бы на вышыні, у асвежаным навальніцамі паветры вяршынь. Нездарма так добра ўдаюцца паэту горныя пейзажы, хаця б вось гэты, з верша пра начлег на Сіхотэ-Аліньскім перавале:

> Сціхаюць словы —
> І мне ў галовы
> Кладзе Прымор'е
> Свае сузор'і.
> Чаму ж я помню
> Аб тонкім промню,
> Што дагарае
> На небакраі?

Заўважце, як напружана і тонка, быццам жылка на скроні, трымціць і пульсуе рытм у гэтых радках.

Своеасаблівая хада паэта з перавала на перавал, па стромкіх вяршынях думкі і вобраза не робіць, аднак, уражання пуставатай гульні ў гігантаманію, бо ёсць у гэтай хадзе і тое, што адрознівае сапраўдную паэзію ад вонкавых, танных падробак: эмацыянальная непасрэднасць і нявыдуманае ўнутранае жыццё.

Шматпланавая, пабудаваная на сутыкненні розных матываў лірычная паэма «Штодзённы лістапад» пачынаецца з біяграфічнага матыву кахання: тут «спружына» паэмы, яе першы віток. І ўся паэма гучыць на такім эмацыянальным напале, што часам нават здаецца, быццам паэт захлынаецца, траціць кантроль над сабой, дазваляе перажыванню затапіць і без таго хісткі масток сюжэта. І яшчэ заўважу, што ёсць у фігуры дзяўчыны, паэтавай каханкі, непатрэбны русалчын налёт, гэткі рамантычны (у дрэнным сэнсе), «прыгожы» флёр. Але ўсё гэта, як кажуць, накладныя выдаткі гаўрусёўскага ўмельства гаварыць ад перапоўненага хваляваннем сэрца, а не проста так, ад здатнасці і ахвоты нізаць радкі.

Захоплены, зачараваны вышыней, С. Гаўрусёў умее бачыць і малое, і часта гэта пранікнёнасць паэта выліваецца ў формы надзвычай тонкія, я б нават сказаў, — артыстычныя, калі б не баяўся гэтага, парадкам ужо зацяганага слова. Вось адна з найбольш характэрных у гэтым сэнсе гаўрусёўскіх мініяцюр:

> Ударыць конь падковай разагрэтай,
> Аж частакол замёрзшы задрыжыць.
> Гатовы сані — дзядзька ў лес сабраўся,
> З саломай цёплай шэпчацца піла.
>
> А з-пад куста струменіцца крыніца,
> І сонца слепіць. Дзядзька заглядзеўся,
> Згарнуў цыгарку, нечага шукае,
> А мне відно — за поясам тапор!

Ці не праўда, хараша? Хараша, што паэт бачыць больш за таго рассеянага, — сонца, вясна! — задуменнага дзядзьку, і ціха памоўчвае: сам знайдзі свой тапор... **Такое** паходзіць ад уважлівасці і дабраты, ад цеплыні сардэчнай, і думаю, што і ў **гэтым**, хоць і апасродкавана, няпроста, але зусім пэўна выявілася адзнака нашага савецкага часу з яго рашучым непрыняццем казённай нацягнутасці, маральнага, калі хочаце, бюракратызму ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі.

Што выклікае пярэчанні ў гаўрусёўскім зборніку «Шчодрасць»? Перш-наперш непамерная яго перанасычанасць маланкамі і громам. Жах, колькі іх у кнізе!

«Букет маланак трапяткі», «грымець бы, як гром над барамі», «роскат праўды перуновай», «грымотная мова», «крок, паўтораны грамамі», [illegible] «маланка шумна далі асвятліла», «густых грымот гул табунны», «маланкі быстрыя прадуць», «гром [illegible]», «рык маланак», «бліскавіцы прападаюць з вока» і г. д. і г. д.

Дзеля таго, каб утрымацца на высокім рамантычным узроўні мыслення, паэту зусім не абавязкова перапоўваць сабе маланкамі і рабіць такі [illegible] вэрхал у нябёсах. Гэта — відавочная ўступка благому густу і кніжнаму, запазычанаму рамантызму. Як правіла, гром у паэзіі пачынае грымець асабліва гучна тады, калі падае ўнутранае напружанне верша і глухне думка [illegible] Гаўрусёў павінен папярэдзіць, бо яна для паэта небяспека рэальная.

Праяўляецца гэта небяспека не толькі там, дзе Гаўрусёў [illegible] у стыхіі лірычнага альбо [illegible]

> Тады паэт [illegible]
> [illegible]
> Свабодный падзі свае [illegible]

[illegible] радка: на найвышэйшым... што за «нана»?..

Пра сваіх братоў, што таксама палі на фронце, Гаўрусёў піша:

> Насуперак
> Усім улікам,
> Набачна стаўшы у страі,
> За дробязю
> І за вялікім
> Глядзяць яны
> У любой сям'і...

Гэта сказана добра, калі пакінуць у баку зусім не зразумелыя «улікі». Добра, таму што праўдзіва ў грамадзянскім сэнсе: тых, хто паў за радзіму, сапраўды глядзяць за ўсім, што робіцца ў нашай вялікай савецкай сям'і, яны — непадкупнае наша сумленне. Вось і чакаеш ад Гаўрусёва, каб і ён, малодшы з братоў, таксама глядзеў «за дробязю і за вялікім», каб ён [illegible] погляд да вяршыняў і зор, выхаваў у сабе грамадзянскую чуласць да ўсяго, што складае маральна-этычную праблематыку сённяшняга жыцця.

[illegible] крывадушнасць, эгаізм і ашуканства, [illegible] на дачы [illegible] атрыманая ў спадчыну ад перыяду культу асобы і яшчэ не пераадоленая да канца [illegible] знешняй [illegible] няўстойлівасць некаторай часткі [illegible] пажадана, каб усё гэта стала С. Гаўрусёва [illegible] шырокага вы-[illegible]

[illegible] вершатвор-[illegible] разглядае [illegible] альбо [illegible] ма-[illegible] абыякаў [illegible] пачуццяў «красы». [illegible] Гаўрусёва, з [illegible] тэмпераментам, [illegible] ўсіх ура-[illegible] сучас-[illegible] і больш [illegible] маральных [illegible]

[illegible] творчага, [illegible] парадку.

С. Гаўрусёў валодае даволі [illegible] культурай. [illegible] захоплены [illegible] напорам [illegible] пругкай [illegible] выраз-[illegible] дакладнасці, [illegible] салдацкія [illegible] адкрываюць [illegible] свецяц-[illegible] і цві-[illegible] тут Гаўрусёў [illegible] гэта [illegible] выпадку [illegible] пра ін-[illegible]

С. Гаўрусёў добра разумее, [illegible] словы, [illegible] за цябе», і [illegible] словы. Але [illegible] сказаць — [illegible]

Вядома, і ў такіх цудоўных і сціслых, багатых зместам гаўрусёўскіх радках пра Амерыку:

> З бандыцкіх рук вазьмі тапор Лінкольна
> І лесарубу чэснаму аддай! —

адчуваецца Пабла Неруда, яго паэма «Хай прачнецца лесаруб!», але адчуваецца недзе ў далечыні і не настолькі, каб перайсці граніцы «дазволенага»: рэмінісцэнцыя з Неруды стала сэнсавым «рычажком». Аднак бываюць паўтарэнні і такога характару, якія ніяк і нічым не могуць быць апраўданы.

Чытаеш такі радок: «І ў нас са сталі і штыкі, і пёры», і прыпамінаеш радкі К. Сіманава: «Перья штампуют из той же стали, которая завтра пойдет на штыки». Сустракаеш такі радок: «Мост прагрыміць, як вераснёвы гром», і на памяць прыходзіць А. Твардоўскі: «И глухо, как огромный мост, простукал где-то гром». Канцоўка аднаго з лепшых гаўрусёўскіх вершаў («Адпраўленне ў палёт»): «І абдымкі мае — не звяно ланцуга, якім будзеш навек да мяне прыкавана», — надзвычай блізкая да адпаведных радкоў М. Луконіна: «Я вернуся к тебе, но кольцо моих рук — не замок, не венок, не спасательный круг». Вядомыя радкі Ул. Маякоўскага: «И редели защитники Зимнего, как зубья у гребешка», — без усякай патрэбы і без усякіх суадносін да цэлага перафразіруюцца С. Гаўрусёвым: «Ужо мільгаюць кіламетры гусцей, чым зуб'е грабянца». «Музыка» Ул. Хадыкі, гучанне яго радкоў: «Штандар чырвоны, штандар чырвоны — вяночак хатак ў агні зары...» раптоўна выплывае ў С. Гаўрусёва: «Садок вячэрні, садок ружовы густога ветра абдаў струмень...» Тут падабенства і ў рытме, і ў інтанацыі, і, галоўнае, у сінтаксісе, — і ад такіх падабенстваў С. Гаўрусёву трэба ўсяляк сябе берагчы...

Падвядзём агульную рысу: Сцяпан Гаўрусёў напісаў добрую, цікавую кнігу вершаў, кнігу пра тое, як радасна і нялёгка «нам даецца вышыня», кнігу, прасякнутую адзінай, важнай і вельмі **сучаснай** па самой сутнасці сваёй паэтычнай думкай: «Святлейшай долі, чалавечай волі павінен дамагчыся чалавек».

С. Гаўрусёў. «Шчодрасць». Вершы і паэмы. Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Мінск, 1962.

Мінскі аўтамеханічны тэхнікум знаходзіцца ў пасёлку аўтамабілебудаўнікоў, недалёка ад заводскай прахадной. Навучэнцы гэтага тэхнікума рыхтуюцца стаць сапраўднымі гаспадарамі магутнай тэхнікі, майстрамі сваёй справы. Але яны ўмеюць не толькі добра вучыцца, але і весела, з вялікай карысцю для сябе праводзіць свой вольны час. У тэхнікуме створаны драматычны і вакальны гурткі, аркестр народных інструментаў, інструментальны квартэт.

На гэтым здымку, які зрабіў фотакарэспандэнт П. Наватараў (БЕЛТА), паказаны заняткі драматычнага гуртка (справа — кіраўнік Л. Нямцова).

СУСТРЭЧЫ З ЮНЫМІ ЧЫТАЧАМІ

У гэтыя дні пісьменнікі Беларусі праводзяць сустрэчы са сваімі маленькімі чытачамі. У рабочых клубах, палацах культуры, бібліятэках адбываюцца літаратурныя ранішнікі, канферэнцыі, абмеркаванні новых кніг. Цікава прайшлі ранішнікі ў Мінску. З наведвальнікамі Мінскай абласной дзіцячай бібліятэкі, дзіцячага кінатэатра, бібліятэкі Кастрычніцкага раёна сустрэліся М. Аўрамчык, Р. Барадулін, А. Дзеружынскі, П. Кавалёў, М. Калачынскі, А. Пальчэўскі, П. Рунец, С. Шушкевіч. У ранішніках, якія адбыліся на фабрыцы імя Калініна, прынялі ўдзел А. Махнач, Я. Садоўскі.

У Барысаве чытачы абмеркавалі аповесці «Андрэйка» і «Лёнька Гром» П. Кавалёва. У канферэнцыі прыняў удзел аўтар.

Канферэнцыі чытачоў па кнізе П. Валкадаева «Чый хлопчык?» з удзелам аўтара адбыліся ў Радашковічах, Быхаве, Калінкавічах.

Са школьнікамі Магілёва сустрэліся М. Гарулёў, С. Грахоўскі, М. Хведаровіч.

У Гомельскім палацы культуры чыгуначнікаў імя Леніна адбыўся вялікі літаратурны ранішнік. М. Даніленка расказаў аб новых кнігах беларускіх дзіцячых пісьменнікаў. Свае творы прачыталі члены абласнога літаратурнага аб'яднання К. Ельчанінаў, М. Клімовіч.

У Палацы піянераў адбылася канферэнцыя чытачоў па кнізе Г. Шыловіча «Запіска на шыбе».

ВЫСТАЎКА ГРАФІКІ

У Віцебскім педагагічным інстытуце адкрылася выстаўка работ студэнтаў мастацка-графічнага факультэта. Многія работы выкананы на прафесіянальным узроўні. Цікавыя работы студэнта трэцяга курса Н. Азарэнкі «На будаўніцтве сельскай электрастанцыі», «Вясна» і інш. Студэнт другога курса В. Пацэвіч выставіў работы пра жыццё і працу будаўнікоў Полацкага нафтагіганта. Яго аднакурснік А. Ісачанкаў дэманструе лінагравюры «Тут будзе дом», «Пад пагрузкай».

На выстаўцы ёсць раздзел афармлення кніг. Асабліва заслугоўваюць увагі ілюстрацыі да рамана Г. Сянкевіча «Крыжаносцы», выкананыя студэнтам А. Мейлунам. Добрыя акварэльныя эцюды студэнта першага курса Г. Качана «Віды роднага горада», замалёўкі архітэктурных помнікаў Ленінграда і архітэктурных ансамбляў Мінска, зробленыя студэнтам Ф. Гуменам.

У ЗАЛЕ ВЫСТАЎКІ. Фота Г. КУЛЯШОВА.

ТОЛЬКІ НА ПОЎНУЮ СІЛУ!

Давайце раскажам аб тым, чаго глядач не бачыць. А ён не бачыць Гамлета, які гуляе за кулісамі ў шахматы і шкадуе, што частыя і працяглыя выхады на сцэну замінаюць гульні. Не бачыць Нілы Сніжко, якая сварыцца з буфетычыцай за тое, што ёй не пакінуты апельсіны. Не бачыць артыстаў, якія проста ў грымах спяшаюцца ўцячы на канцэрт. Ці зачаруем мы ў такім разе гледача свежасцю і непасрэднасцю пачуццяў?

Можа здацца, што ў палемічным запале аўтар збіўся на жанравыя замалёўкі насценгазетнага плана. Гэта не так. Думкі аб сінтэтычнасці сучаснага тэатра правільныя, але артыст, бясспрэчна, галоўная асоба ў ім. Праверыць гэта надзвычай проста: паслухаць рэжысёра аднаго, без артыстаў, ідуць толькі ў выпадку лекцыі, творчай сустрэчы, да мастака — у выпадку выстаўкі, а артысты нават у найпрасцейшых сукнах усё ж застануцца тэатрам.

Як ні цяжка бывае іншы раз у канвееры спектакляў, асабліва выязных, — іграць трэба без скідак. Псіхатэхніку акцёра лёгка разбэсціць, разбурыць, дазволіўшы ёй працаваць «на паўнагі». Раз дазволіў, другі, а там і захочаш сыграць як след, але ўжо нельга будзе, ужо не ўзнікнуць тыя рэфлексы.

Чым жа ў такім выпадку тэатру абараняць творчае права на існаванне?

Сёння спектакль — вось галоўнае. А ці ж не бывае так: ідзе паказ, а ў сутарэнні, замінаючы і акцёрам, і гледачам, гудзе цыркулярка, свішча піла, якою пілуюць бервяно. Дзесьці, хоць і даволі далёка, але добра чутна, як збіваюць станкі. У масоўцы не хапае шасці чалавек. Гэта ўсё адзнакі надыходзячай прэм'еры. А як жа сённяшні спектакль? Ды бог з ім, ён ужо адыграны, рэцэнзіі сабраны. А вось прэм'ера!

І грукаюць малаткі, размаўляюць у кулісах рабочыя, якія не прывучаны да законаў акцёрскай творчасці і не вераць у іх. А невялікая група выканаўцаў без энтузіязму абараняе перад гледачом прэстыж тэатра — гэтага і наогул.

Хіба добра так?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

толькі ў такой расшыфроўцы: затрата мінімальных выяўленчых сродкаў для вырашэння мастацкай задачы. І тады без усялякіх дадатковых спрэчак стане ясна, што адзін крытэрый лаканізму ў эцюдзе мастака, у навеле, у камічнай сцэнцы, а другі — у карціне, рамане, п'есе. А Таўстаногаў у якасці прыкладу прыводзіць вядомую чэхаўскую пераробку маналога Андрэя ў «Трох сёстрах», які звёўся да рэплікі: «Жонка ёсць жонка». Гэта небяспечным чынам спрашчае пытанне і часта прыводзіць да таго, што іншы пісьменнік, імкнучыся быць «не горшым за людзей», так глыбока хавае падтэкст, што знайсці яго амаль немагчыма. Мы сталі сарамліва пазбягаць яркага выяўлення пачуццяў нават тады, калі для гэтага ёсць поўная мастацкая неабходнасць. Гэта збядняе і пазбаўляе праўдзівасці вобразы нашых сучаснікаў.

Г. Таўстаногаў не згодзен з тымі, хто сцвярджае, што лаканізм — гэта стылявая асаблівасць, характэрная толькі для Захаду. А мне здаецца, што абодва бакі не маюць рацыі. Лаканізм у дыялогу не можа існаваць сам па сабе як абавязковы для ўсіх выпадкаў прыём. Ён заўсёды павінен быць разлічаны на пэўныя характары ў пэўных прапануемых акалічнасцях. Лаканізм герояў Рэмарка — вынік спустошанасці, унутранага надлому, нявер'я ды і нежадання што-небудзь высветліць. Гэта агульныя рысы «згубленага пакалення».

Ну, а лаканізм разведчыкаў у баявой аперацыі? Закаханых? Проста абмежаваных людзей?

А калі аб'ектам мастацкага адлюстравання з'яўляецца ідэалагічная ці навуковая спрэчка, як тут быць з лаканізмам, зыходзячы з прыкладаў Таўстаногава?

Я ўсю размову вяду да таго, што тут, як і ў пытаннях формы, наватарства і ў любых іншых пытаннях канчатковым і безапеляцыйным суддзёй выступіць усё тая ж праўда жыцця. Яна ўсё расставіць па сваіх месцах. І мы пераканаемся, што стыль — не адвольная канструкцыя. Яго можна ўгадаць, знайсці ў павевах часу, але нельга вынайсці, прыдумаць і навязаць людзям.

А як жа ў «Крыніцах»?

Я ўжо казаў, што спектакль на дзіва далікатны, не дэкларацыйны. У ім і смелыя мізансцэны, і вострыя ўнутраныя хады ў жыцці герояў, але іх адчуваеш і ацэньваеш не саміх па сабе, а ў агульнай суме дзеяння спектакля. Натуральнасць, арганічнасць нібы ўбірае ў сябе знаходкі, робіць іх непрыкметнымі. Так, здаровы арганізм не прыкмячае ні дыхання, ні біцця сэрца, а без іх — смерць.

РЭПЕРТУАР вызначае аблічча тэатра. Але як часта нашы тэатры забываюць, што падабенства рэпертуару — гэта не падабенства твару, а безаблічнасць.

Няцяжка, зразумець, чаму выдатную п'есу ставяць многія тэатры. Скажам, «Іркуцкую гісторыю» хочацца паставіць кожнаму рэжысёру, сыграць многім артыстам. Яе вельмі чакаюць гледачы. Ну, а, напрыклад, «Чацвёра пад адным дахам»? Якія спакусы — мастацкія ці нават дзелавыя заключаны ў гэтай п'есе? Іх няма. Але — яна апрабіравана! У Акімава іграюць!

А зямля становіцца ўсё меншай. Тэлебачанне разносіць спектаклі па радыёрэлейных лініях. Гастролі паказваюць іх у натуры. Жыццяздольнасць тэатра наогул і кожнага калектыву выявіцца толькі ў тым выпадку, калі рэпертуар яго будзе арыгінальны, своеасаблівы. Няма патрэбы выступаць, калі ты хочаш сказаць толькі — «далучаюся да папярэдняга прамоўцы».

Жаданне мастака-грамадзяніна дапамагчы справай сваёй Радзіме, свайму народу — галоўнае, што павінна вызначаць прынцып, напрамак рэпертуару. Гэты напрамак ярчэй за ўсё выявіць сталасць тэатра, узровень яго майстэрства. І тут без сваёй драматургіі, народжанай адпаведна жаданням і пачуццям тэатра, не абысціся. П'есы прагрэсіўных пісьменнікаў свету таксама неабходны ў рэпертуары. Але іх уключэнне павінна быць апраўдана сур'ёзнымі меркаваннямі, а не рабіцца па нейкай развёрстцы.

Для вырашэння тых ці іншых пытанняў майстэрства можа здацца неабходнай п'еса менавіта такога, а не іншага жанра (зразумела, з улікам зместу), скажам, вадэвіль або камедыя плашча і шпагі.

А найбольш поўнае разгортванне акцёрскіх сіл тэатра? Ці ж гэтая задача не павінна знайсці свайго адлюстравання ў рэпертуарным плане? Магчыма, гэтыя думкі агульнавядомыя. Чаму ж у такім выпадку рэпертуар многіх тэатраў выглядае як нічым не апраўданы набор назваў? Нават у салаце кожны прадукт мае сваё канкрэтнае прызначэнне. А навошта, скажам, у Слуцку ці ў Жалудку паказваць «Небяспечны ўзрост» С. Нарыньяні? Для інструктажу неквваліфікаваных раённых стыляг?

Навошта гамяльчанам, мінчанам і навакольным жыхарам расказваць рафініраваны і надуманы эпізод з жыцця акадэмічнай сям'і, які апісаны ў п'есе Смірновай і Крайндэль пад інтрыгуючай назвай «Чацвёра пад адным дахам»?

Рэпертуар тэатра павінен быць мэтанакіраваным, сваім, асабістым — па напрамку, па запатрабаваннях, па магчымасцях, з улікам густу гледачоў, творчага профілю тэатра.

ТЭАРЭТЫЧНА прынята (або пажадана) лічыць, што кіно і тэлебачанне тэатру не перашкода. Практычна тэатры паказваюць па тэлебачанню толькі сыграныя спектаклі і не бяруць у рэпертуар экранізаваныя творы. І правільна робяць. Шырокі глядач, убачыўшы аднойчы твор на экране кіно або тэлевізара, даведаўшыся яго змест, лічыць пытанне вычарпаным. Толькі ў выключных выпадках ён гатовы вярнуцца да ўжо бачанага ці глядзець яго ў іншай пастаноўцы. Гэта зноў такі пацвярджае неабходнасць арыгінальнага рэпертуару для тэатра. Але, апрача гэтага, тэатр не павінен забывацца на сваё галоўнае адрозненне ад названых мастацтваў — аб творчым працэсе, які адбываецца «тут, сёння, зараз».

А ці ўсё мы робім для таго, каб спектакль — кожны вячэрні паказ быў свежым, напоўненым?

Я ЎСПОМНІЎ аб рэцэнзіях. Аднойчы выказаўшы сваю думку пра спектакль, рэцэнзенты, як правіла, ніколі больш да яго не вяртаюцца. А шкада! Шкада і акцёрам, і гледачам, і чытачам. А хіба самому рэцэнзенту не цікава прасачыць жыццё спектакля? У чым тэатр згодзен з ім, у чым — не? Панаглядаць, а праз пэўны час зноў вярнуцца да яго ў друку. Такія рэйды па старых спектаклях і самі па сабе цікавыя, і павысілі б адказнасць тэатра за лёс спектакляў.

ВЯЛІКАЯ сіла тэатра! Вялізарнае ўздзеянне яго на людзей! З якой, напрыклад, грознай манументальнасцю вытлумачыў цэлую эпоху вобраз Бародкі, створаны ў «Крыніцах» А. Шэлегам. Якая патрабавальная маральная сіла ў вобразе Балатовіча, створаным А. Ільінскім! Гэта чалавек з вачыма дзіцяці і душой загартаванага байца. Часта па-дзіцячаму наіўны і заўсёды па-камуністычнаму стойкі і бескампрамісны! Такога не забудзеш, такім ганарышся. І мімаволі пераГорнеш сваё жыццё: а я які?

Вялікія магчымасці тэатра. І карыстацца імі трэба толькі на поўную сілу.

У Карнея Чукоўскага

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ПІСЬМЕННІКА

Канец сакавіка, але снег ляжыць яшчэ тоўстым дыванам на палях Падмаскоўя. Усё часцей водбліск сонца лашчыць разгалінiстыя вершаліны вялікіх соснаў, пазалотай абдае бярозавыя гаі.

Я іду па шасэ, потым зварочваю на лясную дарожку і шукаю тую сцяжынку са слядамі дзіцячых ног, што вядзе ў передзелкінскі «церамок», да цудоўнага казачніка, выдатнага савецкага пісьменніка Карнея Іванавіча Чукоўскага, якога так любяць і дарослыя, і дзеці.

Домік у лесе, за нізенькай агароджаю з дошак. За шырока расчыненаю брамкаю — дзеці, школьнікі ледзь не ўсіх класаў і дашкольнікі. Яны тоўпяцца ля свайго доміка, які называецца бібліятэкай. Вядома, даўно яны ўсе ведаюць і «Мыйдадзіра», і «Муху-цакатуху», і «Бармалея», і «Тараканішчу» і яшчэ мноства іншых казак, вершаў і апавяданняў, якія напісаў для іх «дзядуля Карней».

...Побач з бібліятэкай — двухпавярховая дача пад стромкім дахам. У ёй жыве і працуе Карней Іванавіч Чукоўскі.

Я застаю пісьменніка за чытаннем пісем. На століку іх вялікі стос — гэта ранішняя пошта, якую Чукоўскі цяпер праглядае. І адкуль толькі яны не прыходзяць, рознакаляровыя гэтыя канверты з рознымі штэмпелямі — з блізкіх і далёкіх гарадоў нашай вялікай Радзімы, з розных краін неабсяжнага нашага свету.

Большасць пісем ад дзяцей. Ім у першую чаргу і адказвае Карней Іванавіч. Іх клопаты, думкі і справы хвалююць пісьменніка, і ён стараецца зараз жа на іх адгукнуцца.

Карней Іванавіч адкладвае пісьмы і запрашае мяне ў свой кабінет. Вялікі пакой з шырокім, на ўсю сцяну, акном і мноствам кніг на акуратна расстаўленых стэлажах уздоўж сцен. Старадаўні, вялікі пісьмовы стол таксама завалены кнігамі, часопісамі, лістамі карэктур. Яркае святло дня пранікае ў кожны куток гэтага прасторнага і ўтульнага пакоя.

Карней Іванавіч садзіцца ў глыбокае крэсла і ўважліва слухае мяне. Ён высокі, крыху прыгорблены, рухі хуткія, жвавая цікавасць да ўсяго і ніякай стомленасці, нічога старэчага. Прыемна слухаць мяккі тэмбр яго голасу, яго сакавітую, каларытную мову.

У апублікаваным спісе работ, вылучаных на атрыманне Ленінскай прэміі ў галіне літаратуры і мастацтва, стаіць кніга Карнея Чукоўскага «Майстэрства Някрасава». Прашу пісьменніка расказаць пра тэтую кнігу.

— «Майстэрства Някрасава» — не новая кніга, — гаворыць Карней Іванавіч. — Яна ўжо выйшла трыма выданнямі. Працаваў я над ёю ўсяго год, але матэрыял збіраў, можна сказаць, усё жыццё.

Яшчэ юнаком да рэвалюцыі Чукоўскі быў вельмі захоплены творчасцю Някрасава. Ён збіраў яго творы, рукапісы. Пазней, ужо будучы пісьменнікам, ён шмат разоў спрабаваў апублікаваць рукапісы паэта, вызваленыя ад цэнзурнай праўкі. Але зрабіць гэта было немагчыма. І толькі пасля перамогі Кастрычніка пісьменнік прыйшоў са сваім каштоўным скарбам да Анатоля Васільевіча Луначарскага. Нарком асветы падтрымаў пачын пісьменніка. Было вырашана выдаць творы Някрасава, цалкам вызваленыя ад цэнзурных скажэнняў. Хутка кніга была выдадзена, і Карней Іванавіч з радасцю даведаўся, што Уладзімір Ільіч Ленін прачытаў яе і даў добрую ацэнку.

За доўгія гады жыцця Карней Іванавіч быў сведкам многіх і многіх падзей. У кнізе «Сучаснікі» пісьменнік цікава расказвае пра свае сустрэчы з многімі выдатнымі людзьмі: пісьменнікамі, мастакамі, артыстамі, палітычнымі дзеячамі. Чытаючы яго ўспаміны пра Горкага, Маякоўскага, Купрына, Рэпіна, Караленку, Луначарскага і многіх іншых дзеячоў, мы нібы зноў бачым іх справы, непаўторнасць іх аблічча, іх неацанімую спадчыну, якая ўвайшла ў скарбніцу савецкай культуры. Успаміны пра іх і складаюць новую кнігу «Сучаснікі», якая выходзіць цяпер трэцім, дапоўненым, выданнем у выдавецтве «Маладая гвардыя».

Новым дапоўненым выданнем у Выдавецтве дзіцячай літаратуры выходзіць і кніга Карнея Іванавіча Чукоўскага, якая абыйшла зямны шар, — «Ад двух да пяці».

З апошніх сваіх работ пісьменнік называе «Зімовую вясёлку», якую выдае Дзяржлітвыдавецтва, «Жывы як жыццё», што выходзіць у «Маладой гвардыі».

Акідваю позіркам кнігі на стэлажах. І сярод многіх тамоў бачу творы беларускіх пісьменнікаў і кнігі самога Карнея Іванавіча, перакладзеныя на беларускую мову і выдадзеныя беларускімі выдавецтвамі.

Інтарэсы і заняткі Карнея Іванавіча Чукоўскага надзвычай разнастайныя і шырокія. Ён не толькі выдатны пісьменнік, перакладчык, грамадскі дзеяч, сябар і настаўнік літаратурнай моладзі, але і самы любімы друг дзяцей. Кожны яго дзень, запоўнены да краёў творчай работай, шматлікімі сустрэчамі, заўсёды спланаваны так, каб у ім абавязкова было месца і для малых.

Вось і зараз, пасля нашай гутаркі, Карней Іванавіч збіраецца ў бібліятэку, у «церам-церамок», што стаіць побач з яго домам. Ён ужо з акна, убачыўшы групу хлопчыкаў і дзяўчынак, што ўваходзяць у бібліятэку, замахаў ім, усміхнуўся і паспяшаўся ўніз, сказаўшы: «Мне пара, дзеці чакаюць, заняткі літаратурнага гуртка зараз у іх».

У казачным лясным доміку кожны юны наведвальнік знаходзіць сабе заняткі па душы. У зале за вялікім авальным сталом ужо сядзяць плячом да пляча дзеці, чакаючы Карнея Іванавіча. Вось зараз ён адчыніць дзверы і яны перанясуцца ў захапляючы казачны свет новых герояў новых кніг.

Бібліятэка ў Перадзелкіне, у падмаскоўным дачным пасёлку, створана вось ужо некалькі год па ініцыятыве і на асабістыя сродкі Чукоўскага. У доміку некалькі пакояў і кожны з іх любоўна і з густам абстаўлены, аформлены. Тут пакой для сустрэч з пісьменнікамі, для заняткаў гурткоў, для гульняў і малявання, кнігасховішча, майстэрня, дзе дзеці самі «лечаць» кнігі, пакой для выдачы кніг на дом.

У фондах Перадзелкінскай бібліятэкі больш дзесяці тысяч тамоў. Да кніг, перададзеных сюды Карнеем Іванавічам, далучылі свае падарункі і многія іншыя пісьменнікі. З навакольных пасёлкаў і вёсак прыходзяць сюды малыя па казку, смех і ўсмешку, па добрую кніжку, якую часам выдае ім сам «дзядуля Карней».

...Калі глядзіш на высокага, сівога, але па-юнацку рухавага і жывога чалавека сярод малых, калі прыслухоўваешся да іх размоў і чуеш іскрыстыя і вясёлы іх смех, разумееш, як патрэбны і неабходны ён дзецям і дзеці яму.

І малыя, і дарослыя чытачы чакаюць ад гэтага нястомнага жыццялюба яшчэ многа кніжак і кніг. Яны патрэбны людзям для міру і для шчасця.

Г. БАКШЭЕВА,
спец. карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва».

У НЕТРЫ ЗЯМЛІ. Фотаэцюд **Ф. КУЧАРА.**

ТАК РЫХТАВАЦЬ КАНЦЭРТЫ НЕЛЬГА

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

У мінулую нядзелю Мінская студыя тэлебачання трансліравала на Маскву канцэрт «Песні савецкіх кампазітараў у выкананні ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці Мінска (Фестываль савецкай песні)». Наўрад ці прынёс гэты канцэрт сапраўднае задавальненне шматмільённым гледачам Саюза. Мяне, напрыклад, ён глыбока расчараваў. Так рыхтаваць канцэртную праграму, я лічу, нельга.

За выключэннем дзвюх-трох песень («Ясны месяц» Ю. Семянякі, «Споем, друзья, споем» Ул. Алоўнікава), большасць твораў былі на дзіва няўдалыя. А калі да гэтага дадаць далёка не лепшы падбор выканаўцаў, ды яшчэ няўдалае гукааформленне і асвятленне, — трэба думаць, дрэннае ўражанне ад канцэрта склалася ў гледачоў Масквы і іншых гарадоў краіны.

І сапраўды, як можна было ўключаць у праграму нецікавую, меладычна-невыразную песню І. Ронькіна «Когда говорят—коммунист» або такую ж няўдалую, музычна-аморфную песню М. Наско «Мінскае мора», напісаную да таго ж на бездапаможныя, непісьменныя словы. Хіба ў нас няма добрых, прыгожых песень, у якіх па-сапраўднаму раскрыты і талент нашых кампазітараў і хараство беларускай паэзіі? Такія песні ёсць, і пра іх, спадзяюся, ведаюць у рэдакцыі музычных перадач тэлестудыі. Чым жа растлумачыць, што ў перадачу былі ўключаны не лепшыя творы, а горшыя? Чым растлумачыць таксама, што ў канцэрт са сталіцы Беларусі (канцэрт цягнуўся паўгадзіны) трапілі ўсяго тры беларускія песні, прычым з іх толькі адна, песня Семянякі, больш-менш удалая? Нават народную песню «Працавалі дзеванькі», адзіную ў канцэрце, і тую як назнарок, выбралі без густу. (Шчыра кажучы, я ўвогуле сумняваюся, што яна народная, па-мойму гэта адна з няўдалых падробак пад сучасны фальклор; я не бачу ў ёй народнай паэтычнай асновы, ды і мелодыя яе надзвычай бедная). Думаецца, што ў перадачу на Маскву патрэбна было ўключыць пераважна беларускія песні — лепшыя творы як прафесіянальных, так і самадзейных нашых кампазітараў. Відаць, я не памылюся, калі скажу, што масквічоў (і не толькі масквічоў) куды больш зацікавіла б якраз такая праграма з ярка выяўленым нацыянальным абліччам

Сорамна і крыўдна, што беларускае песеннае мастацтва, якому ёсць чым пахваліцца, было паказана ўсесаюзнаму гледачу ў такіх узорах. Не ведаю, чым кіраваліся арганізатары перадачы, але толькі не клопатамі аб папулярызацыі сапраўды лепшых здабыткаў беларускіх кампазітараў у жанры песні.

Ніл ГІЛЕВІЧ.

Падзеі. Факты. Навіны

«Беларуская музыка» — так называлася лекцыя-канцэрт, якую правёў калектыў Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра ў г. Вілейка. Лекцыю прачытаў народны артыст БССР І. Жыновіч. Затым былі выкананы творы беларускіх кампазітараў. Падобныя лекцыі-канцэрты адбыліся ў Івянцы, Барысаве, Беразіно, Мар'інай Горцы. У іх прынялі ўдзел лектары Л. Аўэрбах і М. Крэйгер.

□ У Віцебскім гарадскім доме культуры адбыўся сольны канцэрт лаўрэата міжнароднага конкурсу музыкантаў-выканаўцаў у Рыо-дэ-Жанэйра піяніста Сяргея Дарэнскага.

Аматары фартэпіяннай музыкі праслухалі ў выкананні маскоўскага артыста творы Л. Бетховена, Ф. Шапена, Д. Шастаковіча.

С. Дарэнскі выступіў таксама перад тэлегледачамі беларускай сталіцы.

□ Канцэрт ленінградскага артыста, лаўрэата міжнароднага конкурсу В. Маргуліса адбыўся ў Баранавічах. Праграму канцэрта склалі творы Ф. Ліста, С. Пракоф'ева і ўрыўкі з музыкі І. Стравінскага да балета «Пятрушка».

□ У спектаклі Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна тэатра оперы і балета — оперы Дж. Вердзі «Баль-маскарад» прыняў удзел народны артыст УССР А. Казярацкі. Вядомы майстра ўкраінскай опернай сцэны выканаў партыю Рычарда.

□ У Мінску і Бабруйску адбыліся канцэрты артыстаў маскоўскай эстрады з удзелам вядомай жанравай спявачкі Т. Краўцовай. У канцэртах прынялі ўдзел канферансье А. Барушной, жанглёр М. Мешчаракоў, спявак С. Ялохаў, артысты арыгінальнага жанра І. Дзіваў і А. Сцяпанава і іншыя.

Усяго маскоўскія артысты наладзілі для працоўных Беларусі 6 канцэртаў.

НА АБЛАСНЫХ ФОТАВЫСТАЎКАХ

ПАРТРЭТЫ, ПЕЙЗАЖЫ, ЭЦЮДЫ

З прыемнасцю аглядаеш творы фотааматараў — удзельнікаў другой Магілёўскай абласной фотавыстаўкі. Радуешся, што большасць аўтараў падыходзяць да справы не як простыя рамеснікі, а як сапраўдныя мастакі.

У работах магілёўскага фотамайстра М. Жалудовіча найбольш ярка відаць мастацкі падыход да выбару тэмы.

Сярод лепшых здымкаў М. Жалудовіча: «Судзейская калегія», «Выпадак на футбольным полі», «Важнае паведамленне», «На сцэне—мама». Гэта—жывыя малюнкі нашай сучаснасці. І хаця ў рэпартажным здымку фатограф літаральна не можа ўмешвацца ў рэчаіснасць, не можа нешта змяніць або перайначыць, тым не менш аўтару ўдалося знайсці для кожнага з іх сваю, асаблівую кампазіцыю.

Найбольшых жа творчых удач М. Жалудовіч дабіваецца ў партрэтных здымках. Пра гэта сведчаць яго работы — «Ударнік камуністычнай працы», «Брыгадзір Аркадзь Горскі», «Завочніца Вара Козырава».

Чалавеку сённяшніх дзён прысвяцілі свае творы многія фотааматары вобласці.

Нядрэнна вырашана і кампазіцыйна пабудавана работа рэнтгенатэхніка Магілёўскай чыгуначнай бальніцы А. Рагоўскага — «Любімы вобраз». Над сталом схіліўся малы. Увага яго сканцэнтравана на аркушы паперы, дзе з-пад алоўка вырысоўваецца партрэт Ільіча. Аўтар здолеў не толькі падглядзець, але і перадаць натхнёнасць маладога мастака.

Партрэт закройшчыцы абутковай фабрыкі камсамолкі Зінаіды Цухман выкананы служачым А. Якаўлевым. Адсутнасць належнай тэхнікі выканання, недастатковае веданне законаў святу і ценю не дазваляюць, на жаль, гэтаму аматару пакуль што падняцца да сапраўднага фотамастацтва.

Асобна вылучаюцца на абласной фотавыстаўцы творы інжынера завода пад'ёмна-транспартнага абсталявання А. Сідлерава. Гэта — ў асноўным пейзажы. Праўда, краявідамі роднай прыроды захапляюцца многія фотааматары. На жаль, не ўсім ім удаецца выказаць у здымку настрой. У большасці выпадкаў гэта проста адлюстраванне прыгожых мясцін.

Зусім іншым шляхам ідзе А. Сідлераў. У навакольнай прыродзе ён шукае найбольш характэрнае. Матывы яго не проста радуюць вока гледача, яны расказваюць. Вось, напрыклад, пейзаж «Аганькі». Змрок глыбокай ночы ахутвае далі. На пярэднім плане смела выхаплены асветленыя скупым промнем ліхтара гурбы глыбокага снегу. Тут, як відаць, толькі што прайшла з далёкага шляху аўтакалона туды, дзе з цемры ледзь-ледзь выглядваюць агеньчыкі чалавечага жылля.

У фотаэцюдзе «Ранак» А. Сідлераву ўдалося адлюстраваць трапяткое дыханне чэрвеньскага світанку. Лёгкі туман, скупыя праменні сонца на ўсходзе ў кантрасце з каржакаватымі дубамі ствараюць непаўторнае ўражанне.

Праўда, у пошуках арыгінальнага вырашэння тэм аўтар, часам, таго не заўважаючы, зніжаецца да адлюстравання даволі вычварных матываў, якія навяваюць нейкую надломленасць, хваравітасць («Ноч»).

Імкненне А. Сідлерава закампанаваць кожную тэму ў квадратны кадр не заўсёды апраўдвае сябе, а часам нават шкодзіць. «Лясное возера», напрыклад, хацелася б бачыць у гарызантальным фармаце. Гэта дало б магчымасць паўней раскрыць матыў, дапоўніць яго патрэбнымі дадатковымі элементамі. І наадварот фотаэцюд «У лесе» сам просіцца ў вертыкальны кадр.

Багатымі жыццёвымі назіраннямі парадаваў фотааматар Я. Татараў. На яго здымках можна знайсці салют у Маскве і вечар на Влтаве, пражскі універсітэт, вуліцы Мінска і многія іншыя мясціны нашай Радзімы і краін народнай дэмакратыі. Ёсць на яго стэндзе бытавыя здымкі («Горача», «Пад воблакі»), эпізоды будаўніцтва («На пярэднім краі», «Мантажнікі»).

Не хапае адпаведнага настрою пейзажным здымкам С. Фрумкіна, А. Рагоўскага, А. Якаўлева, М. Сідарэнкі і іншых удзельнікаў выстаўкі.

Хочацца, каб магілёўскія фотамайстры больш сур'ёзна паставіліся да сваёй справы, вырашылі ўзнятыя тэмы сапраўды па-мастацку, каб яны надавалі больш увагі адлюстраванню вобраза героя-сучасніка.

А. КАНДРУСЕВІЧ.
Магілёў.

ЛЯ РОДНАЙ ХАТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)

маеш, будзеш пісаць тое, што табе захочацца? Дудкі! Гледзячы да каго ў рукі трапіш. А, можа, і халтурыць давядзецца. І калі і быў у цябе сякі-такі талент, тут яму і хана. Разумееш, дурная твая галава? З першых крокаў за васьмушку хлеба пяро прадаваць? Так сапраўдныя пісьменнікі не нараджаюцца».

Раніцаю да дзядзькі зайшоў другі пляменнік, у парадной форме горнага інжынера.

«Вось, — паказаў Эдуарду дзядзька, — гэта я разумею. Спецыяльнасць. Інжынер! У экспедыцыю едзе. Краіну ўбачыць. А ты?.. Паслухай, пляменнік, звярнуўся дзядзька да стрыечнага брата Эдуарда, — вазьмі гэтага дурня за руку, ды завядзі ў свой інстытут. А то ў яго галава мякінаю набіта, не ведае, якою дарогай у жыццё ісці».

Так Эдуард Яновіч аказаўся студэнтам горнага факультэта Маскоўскага інстытута каляровых металаў і золата імя М. І. Калініна.

Вучоба давалася лёгка. Персанальны стыпендыят, ён меў права свабоднага наведвання лекцый. Размова з дзядзькам глыбока запала ў душу, асабліва словы пра студэнцкія штаны і васьмушку хлеба. Стыпендыі на штаны і на хлеб хапала. Але Эдуарду патрэбны былі грошы, шмат грошай — на кнігі, прага да якіх адольвала хлопца; на музеі, тэатры, канцэрты, лекцыі. Ён працаваў паштальёнам, кур'ерам, шахцёрам на Метрабудзе, на лініі Парк культуры — Фрунзе — Спартыўная.

Насіўся па старажытнай сталіцы, адчуваючы ў целе прыемную стомленасць і слухаючы запаўшую ў сэрца Пятую сімфонію Бетховена з яе трагедыйнасцю тэмы лёсу: «Хто гэта там?—А гэта лёс».

Эдуард з тых людзей, якія не чакаюць, калі пастукае лёс. Ён сам да яго стукаўся ва ўсе дзверы і вокны. І не толькі ў Маскве. На практыцы ў Ніжнім Тагіле іх, студэнтаў, вадзілі на руднікі па самых дрэнных выпрацоўках з ліўнямі грунтавых вод, з прагнілымі прыступкамі спускаў. Пасля паездкі чалавек пятнаццаць пераваліся на другі факультэт (мамчыны сынкі). Эдуард застаўся. Прафесія яму спадабалася.

— Але, заўважце, не з-за «экзотыкі». Гэтага я цярпець не магу — непарадкаў і іншага.

І вось, будучы студэнтам апошняга курса, прыехаў Эдуард у верасні 1957 года дадому, у свой Слуцк. А тут — будуюць шахты. Пакуль што стаяла адна буравая вышка пад замарозку. Але — перспектывы!

У маі, напярэдадні абароны дыпломнага праекта, у Маскве пашанцавала сустрэць начальніка Беларускага ўпраўлення трэста Шахтспецбуд.

— Вазьміце да сябе. Згодзен на любую работу. Нават праходчыкам.

— Мясцовы? Давай, уцякаць не будзеш, — вельмі празаічна разважыў начальнік і адразу ж выдаў Эдуарду адносіну на імя дырэкцыі інстытута.

Дзіўна, аднак пытанне вырашыць аказалася не так проста. З вялікімі намаганнямі ўсё ж свайго дамогся.

У Салігорску маладому спецыялісту прапанавалі месца ў тэхнічным аддзеле.

— Паперы пісаць? Не, — катэгарычна запратэставаў Эдуард.

І, хоць на вытворчасці былі вакансіі горных майстроў, ён пайшоў спачатку праходчыкам на трэці ствол, дзе начальнікам быў Леанід Фёдаравіч Палякоў.

10 жніўня 1958 года, у дзень закладкі горада Салігорска, пачалі праходку першых метраў ствала.

— Цудоўная работка на праходцы, — смяецца Эдуард. — Па прынцыпу «бяры болей, кідай далей».

Калі пачалося ўмацаванне цюбінгаў, Яновіча прызначылі начальнікам змены праходкі.

У маладога начальніка пачаліся нелады з начальствам.

— Разумееце, я не мог мірыцца з такім становішчам, калі рабочыя, якія выконваюць аднолькавую работу, атрымліваюць па-рознаму. Не верыце? Не можа быць? Бывае! Кадравікі, якія прыехалі сюды з накіраваннем з Падмаскоўя, маюць разрад. Спачатку нашы старобінцы ці хлопцы са Случчыны былі вучнямі. Мінула некалькі месяцаў, яны дагналі кадравікоў, працуюць не горш. А атрымліваюць ледзь не ў два разы менш. І маўчаць. А я не маўчаў.

— Ну і што?

— Перавялі мяне на бетонны вузел.

— І вы здаліся?

— Не. І тут трэба было змагацца. Учарашнія земляробы, якія прыйшлі на вытворчасць, не ведалі, ды і цяпер не заўсёды яшчэ ведаюць свае правы. Куб бетону аплочваецца па расцэнках механізаванага завода, а яны на вузле насілі шчабёнку за 18 метраў. Якая ж гэта «механізацыя?» Я пачаў улічваць усё ў нарадах. Начальнік участка перакрэсліў і напісаў рэзалюцыю: «аплаціць за кошт зменнага майстра».

На галаву Эдуарда пасыпалася мноства спагнанняў.

— Калі б гэта не ў Беларусі, я б паехаў адсюль, — прызнаецца ён.

— Чым жа ўсё гэта скончылася?

— Заяваю.

Эдуард напісаў заяву:

«Начальніку ББШУ ад горнарабочага Яновіча Эд. С.

Прашу перавесці мяне праходчыкам на ствол № 2.

Горны інжынер Яновіч».

«Просьба» горнарабочага, падпісаная горным інжынерам, была задаволена.

Нялёгка даводзілася яму на новым месцы. І тут знаходзіліся ахвотнікі адкрыта паздзеквацца, прынізіць. Трэба пайсці ачысціць канавы або прынесці вентыляцыйныя трубы, тэхнік пасылае Яновіча:

— Ён інжынер, ён разбярэцца, ён гэта зробіць.

Але сярод шахцёраў Эдуард хутка стаў сваім чалавекам.

— Рабіў усё, каб ніхто не сказаў, што звяно працуе на мяне.

Я гляджу на дробную фігуру Эдуарда. Параўноўваю яго з магутнымі гарнякамі — тымі, хто пасля змены ад паўнаты сіл па-блазенскі вязалі ў душавых адзін аднаму вузлы на бялізне. Наўрад ці Эдуарду прыйшло б такое ў галаву...

...У забоі — чатырнаццаць пнеўмаломаў. Страшэнны грукат. Вібрацыя пры рабоце такая, што душу выматвае, а часам лом засядзе ў пародзе так, што без вопытнай дапамогі немагчыма дастаць. Да Эдуарда падыходзіць брыгадзір Герасіменя, спыняе яго:

— Глядзіце.

І брыгадзір паказвае інжынеру-рабочаму, як рабіць раскосіну. Крыху па скосу. Калі ёсць трэшчына, дык — у яе, і ледзь-ледзь варушыць лом, не даючы сашчапіцца з пародаю: тады яго можна ў любы момант павярнуць, куды хочаш.

— Многаму навучыўся я тут. А галоўнае — калектывізму. І адпачыў маральна, — з палёгкаю ўздыхае Яновіч.

— А як жа барацьба?

— Барацьба? — ён горка ўсміхнуўся. — Галоўныя эпізоды яшчэ наперадзе.

— А чаму ж вы ў прафсаюз не звярталіся?

— А вы хіба Віціцкага, старшыню шахткома, не ведаеце?

— Ведаю. Па-мойму, п'яніца.

— У тым вось і справа.

— Чаму ж цярпяць яго на рабоце?

— Бывае... Але думаю, гэта вельмі ненадоўга. Самае большае — да наступных выбараў. Можа, я сам вінават у тым, што ён утрымаўся.

— У чым жа віна?

— А вось у чым...

У Эдуарда з Віціцкім адбылася сур'ёзная бойка. Шчуплы на выгляд, Эдуард трапіў у балючае месца магутнаму Віціцкаму, чым выратаваў сябе. Але... быў суд. Паказальны. У клубе будаўнікоў. Нягледзячы на спачуванне ўсёй залы, суд вымушаны быў, зыходзячы з параграфаў і артыкулаў закона, прысудзіць Яновіча да году зняволення ў папраўча-працоўнай калоніі... умоўна.

Віціцкі быў істцом, пацярпеўшым. Гэта часова павысіла яго службовыя «акцыі». Здараецца ж такое ў жыцці.

Цікава адзначыць дэталь: Яновіч з'явіўся на суд з камсамольскім значком на грудзях. Камсамол ад яго не адмовіўся, бо адчуваў, што яго праўда, хоць і вынес яму вымову.

Пасля здарэння з Віціцкім Эдуард ідзе з Шахтспецбуда на калійны камбінат начальнікам змены пад'ёму. Калектыў уключаецца ў барацьбу за званне змены камуністычнай працы.

Праз два месяцы пасля суда Яновіча выбіраюць членам камітэта ЛКСМБ камбіната, а потым і ўсёй будоўлі. Ён узначальвае камісію па павышэнню агульнаадукацыйнага і культурна-тэхнічнага ўзроўню моладзі.

У змене справы ідуць выдатна. Яе называюць «Змена Яновіча». Спаборнічаючы са зменай Кожухава, яна абганяе «супернікаў» за два месяцы на 88 бодняў пароды. Да майскага свята выкананне плана дасягнула 120 працэнтаў. Змена дружная. Вучацца. Робяць велапрабег у горад Мінск. Сустракаюцца з вучнямі школ. Сямейныя святы становяцца святамі ўсяго калектыву. Самі яны сябе жартам, а магчыма і ўсур'ёз, завуць не інакш, як «гвардзейскі экіпаж».

Вось сяброўскае пажаданне ад таварышаў, якое Эдуард захоўвае як дарагую рэліквію. Яго напісалі самі хлопцы ў дзень «абмывання» першынца— сына ў сямействе Яновіча.

Желаем, друзья, чтоб
гремела по праву
О вашей семейке хорошая
слава!
Чтоб ваша семья ежегодно
росла
И эта коляска
хорошей и ласковой
Новым друзьям
колыбелью была.

Падпісана: «Гвардзейскі экіпаж».

Вялікая дружба нараджала вялікую энергію. За працоўныя поспехі Яновіч і машыніст Аляксандр Тычына ўзнагароджваюцца ганаровымі значкамі ЦК ВЛКСМ «Перадавік вытворчасці». Устарэлі ўжо, як відаць, вершы ў салігорскай шматтыражцы:

Не прославлен он еще
работой,
Нет медалей на его груди...

Праслаўлены і адзначаны!

— Вы ведаеце, кажуць у народзе: адна бяда не жыве, а шчасце за шчасцем ідзе. У мяне летась было шмат бед. А сёлета вельмі многа шчасця,—і Эдуард пачынае па пальцах пералічваць этапы гэтага шчасця. — Прыняты кандыдатам у члены КПСС; семнаццатага кастрычніка, у дзень адкрыцця XXII з'езда зацверджан завучам тэхнікума; васемнаццатага нам, змене, прысвоілі імя XXII з'езда; у сакавіку нарадзіўся сын; у чэрвені паступіў завочна вучыцца на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Бачыце, колькі шчасця чакала Эдуарда Яновіча ля роднай хаты!

Дзеля гэтага варта было ірвацца сюды. Дзеля гэтага варта і жыць і змагацца.

А як жа барацьба з Віціцкім, спытаеце вы. З-за чаго была бойка і чым усё гэта скончылася?

Перада мною дакумент — пастанова прэзідыума Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў. У ёй паведамляецца аб перараздзліку з выплатаю розніцы ў зарплаце ўсім рабочым-праходчыкам вертыкальных ствалоў Салігорска. Дакумент заклікае савецкія і адміністрацыйныя органы прыцягнуць вінаватых да суровай адказнасці. А іншыя з абвінавачаных, як старшыня шахткома Віціцкі, значацца ў пастанове толькі як былыя.

Добры дакумент! У імя яго з'яўлення варта было змагацца.

І гэта — таксама вялікае шчасце.

Сацыялістычная Румынія сёння

Так называецца выстаўка мастацкай фатаграфіі, якая адкрылася ў памяшканні Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. На выстаўцы прадстаўлена каля 100 работ, прысвечаных будаўніцтву новай Румыніі. Цікавыя работы: «Нарадзілася новае мора», «Льецца сталь», «Хваля пражы», «Добры ўраджай» і многія іншыя.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-20-54, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-22-04, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу.

АТ 12835

Друкарня выдавецтва «Звязда».